ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН ЗЛУЧАЙЦЕСЯ! פּראָלעטאַריער פון אַלע לענדער, פאַרייניקט זיך! ПРОЛЕТАРИИ ВСЕХ СТРАН, СОЕДИНЯЙТЕСЬ! PROLETARJUSZE WSZYSTKICH KRAJÓW, ŁĄCZCIE SIĘ!

Адрэс рэдакцыі і канторы
Менск, Пляц Волі № 17, 1-шы паверх
ТЭЛ. Сакратара—№ 478, Рэдактара—№ 769, Канторы—№ 244, Сектара прамысловасьці—№ 615

XI ГОД ВЫДАНЬНЯ ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

№ 51 (3140) ПАНЯЗДЗЕЛАК 2 САКАВІКА 1931 ГОДУ

КОШТ НУМАРУ 5 КАП.
ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:
На 1 месяц . . — 90 к.
„ 3 „ . 2 р. 70 к.
„ 6 „ . 4 р. — к.
„ 1 год . 8 р. — к.

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў і Савету Народных Камісараў Б. С. С. Р.

Алма-Ата Дөнмна 81, гос. публич. библиотека (СБ-1) 1931 г.

Заключная прамова тав. Чарвякова на закрыцьці X Усебеларускага зьезду Саветаў

X Усебеларускі Зьезд Саветаў уваходзіць у гісторыю, як першы зьезд пэрыяду сацыялізму, як зьезд, асноўнай задачай якога зьявілася мабілізацыя сіл рабочае клясы і ўсіх працоўных пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі на завяршэньне пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі савецкай краіны.

Усе пытаньні парадку дня зьезду разглядаліся пад кутом погляду вырашэньня гэтай асноўнай задачы. Зьезд адзначыў, што палітычная лінія ўраду палкам адпавядае генэральнай лініі партыі.

Зьезд ухваліў практычную дзейнасьць ураду Беларусі. Гэта значыць, што рабочая кляса ці найшырэйшыя масы працоўных Савецкай Беларусі прызналі здавальняючай усю гую вялізарнейшую работу саветаў Беларусі, якая была накіравана на разгортваньне індустрыялізацыі краіны, на сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі і ліквідацыю на базе суцэльнай калектывізацыі кулацтва, як клясы, на разгортваньне задач культурнай рэвалюцыі, на правядзеньне мерапрыемстваў па палянізацыі дабрабыту рабочае клясы і ўсіх працоўных.

Яскравымі сьведкамі дасягненьняў Савецкай Беларусі ў справе сацыялістычнага будаўніцтва за мінулы час зьявіліся тыя прывітаньні рабочых ад фабрык і заводаў, саўгасаў, калгасаў, ад культурных устаноў, што былі заслуханы за час работы зьезду. Амаль у кожным з гэтых прывітаньняў гаварылася аб новых фабрыках і заводах, саўгасах, калгасах, навучальных установах, што пабудаваны ў Савецкай Беларусі за апошнія гады.

Трэба яшчэ і яшчэ раз падкрэсьліць, што ўсе гэтыя дасягненьні зьявіліся вынікам вялікага ўздыму энтузіязму з боку рабочае клясы і ўсіх працоўных БССР.

Асноўнай фігурай у сацыялістычным будаўніцтве зараз зьяўляецца ўдарнік на фабрыцы, заводзе, калгасе. Паказваючы сапраўды камуністычныя адносіны да працы, ударныя брыгады ўзьнімаюць самыя шырокія масы працоўных на барацьбу за ўзьняцьце прадукцыйнасьці працы, за палепшаньне якасьці, на ўдарнае перамаганьне пяжкасьцяў, што сустракаюцца на шляху сацыялістычнага будаўніцтва.

Аб гэтай асаблівасьці сучаснага пэрыяду яскрава сьведчыць таксама склад X Усебеларускага Зьезду Саветаў, дэлегатамі якога ў большасьці зьяўляюцца ўдарнікі фабрык, заводаў, калгасаў.

Вялізарнае гістарычнае значэньне маюць пастановы Зьезду Саветаў аб далейшых задачах БССР ў галіне сацыялістычнага будаўніцтва. Гэтыя пастановы яшчэ раз падкрэсьліваюць, што работа Саветаў і савецкага ўраду павінна праходзіць на аснове бязупыннай барацьбы за генэральную лінію партыі, супроць правага і «левага» апартунізму, на аснове выкананьня той разгорнутай праграмы сацыялістычнага будаўніцтва, што вызначана XVI зьездам УсеКП(б) і XIII зьездам КП(б)Б.

Важнейшымі задачамі гэтай праграмы зьяўляюцца:

Выкананьне і перавыкананьне пляну будаўніцтва сацыялістычнай прамысловасьці, колькаснае і асабліва якаснае выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

Другая задача заключаецца ў бязупыннай барацьбе за сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі, за суцэльную калектывізацыю і на гэтай аснове ліквідацыю кулацтва, як клясы.

Той магутны рух у калгасы, які назіраецца ў нашай вёсцы з боку бяднякоў-серадняцкіх гаспадарак, даў магчымасьць паставіць задачу ўцягненьня ў калгасы за час веснавой сяўбы да 30 проц. усіх бяднякоў-серадняцкіх гаспадарак.

Важнейшым вучасткам нашай работы зьяўляецца справа культурнага будаўніцтва. Пасьпяховае сканчэньне мерапрыемстваў па ўсеагульным навучаньні дзяцей школьнага ўзросту, палітэхнізацыя школы, ліквідацыя няпісьменнасьці сярод дарослых, падрыхтоўка кадраў ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва, шырокае разгортваньне навукі, літаратуры, мастацтва, выдавецкай справы і г. д.—усё гэта разам узятае павінна садзейнічаць магутнаму ўздыму будаўніцтва культуры нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьместу.

Трэба, каб кожны працоўны Савецкай Беларусі цьвёрда ўявіў сабе ўсю важнасьць і адказнасьць гэтых задач і напружваў усе свае сілы для іх выкананьня.

Барацьба сацыялістычнага ладу з рэшткамі капіталізму ў нашай краіне на даным этапе набыла надзвычайную вострасьць. Чым больш разгортваецца сацыялістычнае наступленьне па ўсім фронце, тым з большай жорсткасьцю адбываюцца супраціўленьні аджываючых клясаў. Гэта клясавая барацьба адбываецца на кожным вучастку сацыялістычнага будаўніцтва, у кожным зьвяне нашай работы. Клясавы вораг імкнецца затрымаць бязупынны, пераможны ход сацыялістычнага будаўніцтва, імкнецца выкарыстаць кожны выпадак для сваіх контррэвалюцыйных мэт. Гэта вымагае ад усіх нас асаблівай клясавай пільнасьці, пралетарскай загартаванасьці, бальшавіцкай самаддачнасьці.

Цяжкасьці, што сустракаюцца на нашым шляху, зьяўляюцца цяжкасьцямі росту. Для таго, каб хутчэй перамагчы гэтыя цяжкасьці, мы павінны ня толькі ня спыняць узятых намі тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, але, наадварот, яшчэ больш іх разгортваць, узьнімаць на вышэйшую ступень. Усякаму імкненьню клясавых ворагаў выкарыстаць цяжкасьці нашага будаўніцтва для сваіх контр-рэвалюцыйных мэтаў, мы і далей будзем даваць зьнішчальны адпор.

Асаблівасьцю сучаснага пэрыяду зьяўляецца тое, што абвастрэньне клясавай барацьбы выключае магчымасьць прыкрывацца нейтральнасьцю. Сёньня барацьба за сацыялізм патрабуе ад кожнага асабліва выразнага адказу: з кім ён ідзе, на якім баку барыкады ён знаходзіцца? Гэта мы яркa бачым на прыкладзе тэй інтэлігенцкай праслойкі, у дачыненьні да якой выявілася, што за павіцьцем «нейтральнасьці» хавалася іх дапамога імпэрыялістычным інтэрвентам у барацьбе супроць улады Саветаў. Гэта таксама яскрава відаць і на прыкладзе групы беларускіх контр-рэвалюцыйных нацыянал-дэмакратаў, якія зьяўляюцца агентамі польскага фашызму ў падрыхтоўцы да інтэрвэнцыі супроць Савецкай Беларусі.

У выніку пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва база савецкай улады ўсё больш пашыраецца як у горадзе, так і ў вёсцы. Асноўныя масы працоўнай інтэлігенцыі шчыльна зьвязалі свой лёс з лёсам рабочае клясы, яны



ідуць пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі за перамогу сацыялізму. Асноўная маса працоўнай інтэлігенцыі ў выглядзе настаўніцтва, на якую ў першую чаргу разьлічвалі нацдэмы, верна дыктатуры пралетарыяту і разам з рабочай клясай вядзе барацьбу супроць усіх ворагаў, за перамогу сацыялізму. Гэта дало падставы партыі і ўраду Беларусі ўзнагародзіць настаўніцтва БССР ордэнам працоўнага чырвонага сьцягу.

Мы маем права выказаць упэўненасьць у тым, што іншыя праслойкі працоўнай інтэлігенцыі Савецкай Беларусі ў сваёй масе таксама зьяўляюцца вернымі справе сацыялістычнага будаўніцтва.

Самае важнае ў нашай далейшай рабоце заключаецца ў тым, каб кожны біўся за хутчэйшае і поўнае выкананьне пастаўленых партыяй задач. Праверка выкананьня на кожным кроку—вось парука пасьпяховага руху наперад. Кожную справу, якую даручае нам партыя і ўлада, вывучаць дасканала для таго, каб умець сапраўды кіраваць гэтай справай. Тав. Сталін наказаў кіраўнікам прамысловых прадпрыемстваў, каб яны аўладалі тэхнікай для таго, каб быць сапраўднымі чырвонымі дырэктарамі. Мы павінны гэту важнейшую дырэктыву тав. Сталіна пашырыць ва ўсе галіны нашага будаўніцтва.

Асабліва важную ролю на даным этапе сацыялістычнага будаўніцтва адыгрываюць сельсаветы і райвыканкомы. У сувязі з ліквідацыяй акруг раённыя зьвяновы савецкай сыстэмы зьяўляюцца апорнымі пунктамі кіраўніцтва. Гэта патрабуе ад нас узмацненьня «кіраўніцтва работай сельсаветаў і райвыканкомаў.

X Усебеларускі Зьезд Саветаў ужо вынес пастанову аб разгортваньні ўдарнай работы па выкананьні пляну загатовак і мабілізацыі грашовых рэсурсаў. Значэньне гэтых задач яскрава відаць з таго, што зьезд 25 проц. свайго складу мабілізаваў для непасрэднай работы ў гэтай галіне. На выкананьне гэтых задач мы павінны мабілізаваць усе нашы сілы.

ЦК партыі і Савет Народных Камісараў ускладаюць на мясцовыя партыйныя арганізацыі і выканкомы такую адказнасьць за своячасовае выкананьне пастановы ЦК і СНК па транспарту, як за выкананьне важнейшых палітычных кампаній: збожжазагатовак, веснавой сяўбы, прамфінпляну і г. д. Пытаньню работы транспарту трэба аддаць магчыма больш увагі таму, што разгортваньне сацыялістычнага будаўніцтва нашай краіны шчыльна на зьвязана са становішчам транспарту.

Важнейшай задачай, якая стаіць перад намі, зьяўляецца пасьпяховае правядзеньне другой бальшавіцкай вясны. X Усебеларускі Зьезд Саветаў устанавіў пераходны сьцяг для ўзнагароды лепшага фаўну па выкананьні задач другой бальшавіцкай вясны і калектывізацыі. Мне хочацца выказаць упэўненасьць у тым, што гэта пастанова Зьезду будзе садзейнічаць шырокаму разгортваньню сацыялістычнага спаборніцтва паміж раёнамі, сельсаветамі, калгасамі, саўгасамі і вёскамі на лепшае правядзеньне веснавой сяўбы.

У час работы зьезду мы заслухалі цэлы рад выступленьняў паасобных рабочых, калгасаў, якія абвясьцілі сябе ўдарнікамі у гонар X Усебеларускага Зьезду Саветаў.

Вось, таварышы, адна з такіх заяў ад былога камандзіра арганізатара чырвонага партызанскага атраду Цэвана, Ціхана Сыльвэстравіча:

«У дні заваёў Кастрычніцкай рэвалюцыі я прымаў вялікі ўдзел у барацьбе з белагвардзейцамі. Я вёў барацьбу разам з вялікімі масамі беднякоў і батракоў. Нам удалося заваяваць уладу Саветаў. Мы нясем назву чырвоных партызанаў. У сучасны момант яны выканаўны пяцігодкі за чатыры гады у сацыялістычнай перабудове сельскай гаспадаркі праз саўгасы і калгасы я таксама абвяшчаю сябе ўдарнікам у гэтай барацьбе, даю ўрачыстае абяцаньне, што буду цьвёрда і настойліва весьці барацьбу за пабудову калгасаў, саўгасаў на вёсцы, уцягваючы батракоў, беднякоў і сераднякоў у калгасы, а таксама буду ўдарнікам у барацьбе з кулацтвам».

Мне думаецца, таварышы, што X Усебеларускі Зьезд Саветаў у адказ на гэтыя жаданьні, у адказ на гэтыя патрабаваньні з боку працоўных Савецкай Беларусі павінен абвясьціць сябе ўдарным. Усе дэлегаты зьезду Саветаў, разьехаўшыся на месцы, павінны ўжыць усе крокі для таго, каб мабілізаваць шырокія масы працоўных на пасьпяховае выкананьне задач трэцяга фашаючага году пяцігодкі, на пасьпяховае выкананьне задачы завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі ў нашай краіне.

Пад кіраўніцтвам слаўнай камуністычнай партыі мы павінны дабіцца таго, каб VI Усесаюзнаму Зьезду Саветаў рапартаваць:

— Савецкая Беларусь зьяўляецца ўдарнай рэспублікай Саветаў на важнейшым вучастку сацыялістычнага будаўніцтва.

Учора пачаўся працэс над контр-рэвалюцыйнай шкодніцкай арганізацыяй меншавікоў-інтэрвэнтаў

Інтэрвэнтам, шкоднікам, крывавым сабакам сусьветнага імпэрыялізму з лягеру сацыял-здрадніцкага другога інтэрнацыяналу, рыхтуючым узброены напад на СССР—пралетарыят і працоўныя масы Савецкага саюзу адказваюць—зьнішчым кожнага, хто асьмеліцца пасягнуць на заваёвы Кастрычніка, хто стане на нашым сацыялістычным шляху

ПЕРШЫ ДЗЕНЬ ПРАЦЭСУ

МАСКВА, 1. Яшчэ доўга да ўпусканьня публікі ўкалённую залю дому саюзаў ён абкружаецца вялікім натоўпам.

Роўна а 5 гадзіне адчыняюцца дзьверы дому саюзаў. Вялізарная заля хутка запаўняецца.

У 6 гадзін 16 хвілін уводзяць падсудных.

У 6 гадз. 20 хвілін за судзейскім сталом зьяўляецца старшыня спэцыяльнага прысутнічаньня Вярхоўнага суду СССР тав. ШВЭРНІК, члены прысутнічаньня тт. МУРАНАЎ і АНТОНАЎ-САРАТАЎСКІ і запасныя члены суду тт. АРЦЮХІНА і ПРАНІШНІКАЎ. За пракурорскім сталом—т. КРЫЛЕНКА і РОЗІНСКІ.

На месцах для абароны—члены Маскоўскай калегіі абароны тт. КАМОДАЎ і БРАЎДЭ. Першы абараняе падсуднага ФІН-ЯНАТАЕЎСКАГА, другі—падсудных РУБІНА і ВОЛКАВА.

Хутка праходзіць працэдура апросу абвінавачваных. Усе яны на пытаньне старшыні заяўляюць аб прыналежнасьці да партый меншавікоў.

Дзяржаўны абвінаваўца т. Крыленка ставіць перад судом хадайніцтва аб выкліку 6 сьведак.

Неабходна ўстанавіць на судзе існую чую сувязь паміж так званым «Саюзным бюро» РСДРП (меншавікоў) і кулацкай контр-рэвалюцыйнай групай, якая называла сябе працоўнай сялянскай партыяй,—кажа т. Крыленка. Для гэтага ён просіць суд выклікаць у якасьці сьведкі ідэйнага кіраўніка і натхняцеля гэтай групы, былога праф. Кандрацьева.

Для ўстанаўленьня сувязі «Саюзнага бюро» з другой контр-рэвалюцыйнай групай—«Прампартыі» абвінавачваньне просіць выклікаць у якасьці сьведак ужо асуджаных па працэсу «Прампартыі» Рамзіна і Ларычава. Абвінавачваньне таксама просіць выклікаць у якасьці сьведак Гвоздзева, Некрасава і Жэлудкова, прыцягнутых ужо да следзтва, справы якіх вылучаны.

Абарона і абвінавачваньне ня маюць супярэчаньня супроць прапановы дзяржаўнага абвінавачваньня.

Спэцыяльнае прысутнічаньне задаволіла хадайніцтва пракуратуры.

Пасьля гэтага сакратаром зачытваецца абвінаваўчае заключэньне.

З глыбокай увагай, пры абсалютнай цішыне выслухала заля абвінаваўчае заключэньне, чытаньне каторага працягвалася каля 4-х гадзін.

Пасьля заканчэньня чытаньня абвінаваўчага заключэньня старшынствуючы Швэрнік, вызываючы да судзейскага стала падсудных, задае ім пытаньне: «ці прызнаеце вы сябе вінаватымі ў праступленьнях, прад'яўленых вам абвінаваўчым заключэньнем?»—Пры напружаньнейшай цішыні прагучэлі словы першага з падсудных Залкінда: «але, прызнаю сябе вінаватым». «Але, прызнаю»—гаворыць выкліканыя па чарзе ўсе падсудныя—Волкаў, Шэр, Громан, Якубовіч, Гінзбург, Суханаў, Берлацкі, Ікаў, Тэйтэльбаўм, Рубін, Фін Яматаеўскі, Пятупін, Сакалоўскі.

Швэрнік аглашае рэгламент пасяджэньняў спэцыяльнага прысутнічаньня Вярхоўнага суду: пасяджэньні будуць праходзіць штодзённа з 10-ці гадзін раніцы да 3-х гадзін дня і з 6 гадзін вечара да 11 гадзін вечара.

Аб'яўляецца перарыў да раніцы 2-га сакавіка.

Магутнай хваляй абурэньня адказваюць пралетары і працоўныя СССР на контр-рэвалюцыйную шкодніцкую дзейнасьць арганізатараў інтэрвэнцыі—сацыял-здраднікаў-меншавікоў

Выкрыем да рэшты сацыял-здраднікаў контр-рэвалюцыйную сутнасьць другога Інтэрнацыяналу

МАСКВА, 1. Прэзыдыум ЦК водзіннікаў прыняў рэзалюцыю, у якой заяўляе: выкрытыя органамі ДПУ контр-рэвалюцыйная група меншавікоў прасьледавала тыя-ж мэты, што і шкоднікі з прампартыі—арганізаваць інтэрвэнцыю супроць СССР, ніспрынуць дыктатуру пралетарыяту, зрабіць СССР калёніяй міжнароднага імпэрыялізму.

Абвінаваўчае заключэньне з поўнай выразнасьцю выкрывае сюрытыя спруны жыны контр-рэвалюцыйнай дзейнасьці сац.-фашысцкага другога інтэрнацыяналу. У судовым разглядзе контр-рэвалюцыйны меншавізм канчаткова пакажа сябе перад тварам усяго сусьветнага пралетарыяту ва ўсёй сваёй контр-рэвалюцыйнай нагаце.

На контр-рэвалюцыйнае здраднічтва меншавікоў рабочая кляса адкажа яшчэ большым згуртаваньнем вакол камуністычнага Інтэрнацыяналу і ленінскай камуністычнай партыі; яна правяць максімум ініцыятывы, творчага ўздыму і яшчэ больш будзе ўмацоўваць абароназдольнасьць нашае краіны.

Сурова пакараць контр-рэвалюцыянэраў меньшавікоў

Заслухаўшы інфармацыю аб пачаўшымся працэсе контр-рэвалюцыйнай меншавіцкай групы Громана, Суханава і іншых, агульны сход рабочых і служачых заводу «Чырвоная Зара» адзначае:

Контр-рэвалюцыянэры — меншавікі імкнуліся разам са шкодніцкай «прампартыяй», «Гандэльтрэмам», пры дзейным падтрыманьні другога інтэрнацыяналу, затрымаць наша сацыялістычнае будаўніцтва і тым самым падрыхтаваць глебу для інтэрвэнцыі супроць Савецкага Саюзу.

Але і на гэты раз шкоднікі выкрыты і стануць перад пралетарскім судом.

Рабочыя і служачыя заводу «Чырвоная Зара» клеймяць ганьбай контр-рэвалюцыянэраў—меншавікоў і патрабуюць ад органаў савецкай улады ўжыць да іх самае жорсткае пакараньне.

У адказ на контр-рэвалюцыйную дзейнасьць Громанаў, Суханавых і інш. рабочыя і служачыя заводу «Чырвоная Зара» яшчэ шчыльней згуртуюць свае рады вакол камуністычнай партыі Ленінскага ЦК у барацьбе за выкананьне пяцігодкі ў 4 гады. Рабочыя абяцаюць узмоцніць ударніцтва і соцнаборніцтва і ўключаюцца ва ўсесаюзны суботнік дапамогі транспарту.

Няхай жыве УсеКП(б) і яе Ленінскі ЦК!

Няхай жыве АДПУ—верны страж заваёў Кастрычніка!

Няхай жыве меч пралетарскай дыктатуры--АДПУ

Рабочыя менскага машына-будаўнічага заводу «Полымя рэвалюцыі» патрабуюць ад пралетарскага суду самага суровага пакараньня шкоднікам—контр-рэвалюцыянэрам, якія скарыстаўшы сваё службовае палажэньне для арганізацыі эканамічнага шкодніцтва, для дапамогі Пілсудскім, Рабушынскім і Пуанкарэ арганізаваць «крывавы паход» супроць Савецкага Саюзу.

У адказ на спробы сусьветнай контр-рэвалюцыі сарваць пераможнае сацыялістычнае будаўніцтва, дэзарганізаваць шматмільённую волю пралетараў—абвяшчаем сябе мабілізаванымі на правядзеньне штурму па ліквідацыі прарываў на транспарце. Бяром на сябе абавязак яшчэ больш узмоцніць абароназдольнасьць нашае краіны, дапамагаць Чырвонай армії.

Няхай жыве меч пралетарскай дыктатуры—АДПУ!

Сьмерць контр - рэвалюцыянэрам — прыслужнікам сусьветнага капіталу!

Выпускам новай пазыкі імя трэцяга году пяцігодкі—адкажам інтэрвэнтам

СТАЛІНА, 1. На прадпрыемствах Сталіншчыны ў зьвязку з судом над меншавіцкай контр-рэвалюцыйнай арганізацыяй адбыліся масавыя мітынгі.

Рабочыя патрабуюць ад Вярхоўнага суду суровай кары для меншавікоў контр-рэвалюцыянэраў. Рабочыя заводзкай капальні просяць саюзны ўрад выпусьціць новую пазыку трэцяга фашаючага году пяцігодкі і загадзя падпісваюцца на гэтую пазыку ў разьмеры месячнай зарплаты.

Арганізацыяй новых ударных брыгад—адказваюць пралетары Харкава на крывавую дзейнасьць сацыял-здраднікаў-меншавікоў

ХАРКАЎ, 1. Пралетарыят Харкава выказвае сваё абурэньне адносна агіднай контр-рэвалюцыйнай шкодніцкай работы меншавікоў, якія імкнуліся падарваць наша сацыялістычнае будаўніцтва.

Рабочыя заводу «Сьвет шахцёра» у прынятай рэзалюцыі заяўляюць: «разам з «прампартыяй» меншавікі, контр-рэвалюцыянэры дапамагалі міжнароднай буржуазіі падрыхтаваць інтэрвэнцыю супроць СССР. Яны спрабавалі дэзарганізаваць нашу сацыялістычную гаспадарку. Заяўляем, што сарваць сацыялістычнае будаўніцтва імпэрыялістам і іх слугам ня ўдасца. Мы патрабуем ад Вярхоўнага Суда ўжыцьця самага жорсткага пакараньня да контр-рэвалюцыянэраў-меншавікоў.

Рабочыя заводу «Серп і молат» заяўляюць: «у адказ на забегі ворагаў з контр-рэвалюцыйнага меншавіцкага балота мы яшчэ шчыльней згуртуем свае рады вакол УсеКП(б) і пад кіраўніцтвам партыі Леніна на чале з тав. Сталіным прыложым усе сілы, каб выканаць пяцігодку ў 4 гады і завяршыць пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі ў трэцім фашаючым годзе пяцігодкі. Патрабуем суровай кары для агентаў сусьветнага капіталу—меншавікоў.

У адказ на контр-рэвалюцыйныя забегі, заяўляюць рабочыя дэпо і станцыі Харкаў—сартыровачная «мы яшчэ больш згуртуем нашы рады вакол ленінскай партыі і абвяшчаем сябе мабілізаванымі на транспорце да канца пяцігодкі. Інтэрвэнцыяністам меншавікам мы адкажам яшчэ большай згуртаванасьцю вакол ленінскай кампартыі, новым уздымам працоўнага энтузіязму, узмацненьнем магутнасьці Чырвонай арміі і абароназдольнасьці краіны.

Бальшавіцкае прывітаньне зоркаму стражу пралетарскай дыктатуры—АДПУ

Заслухаўшы інфармацыю аб пачаўшымся працэсе контр-рэвалюцыйнай, шкодніцкай групы меншавікоў Громанава, Суханава і інш., агульны сход супрацоўнікаў калектыву рэдакцыі канторы і выдавецтва «Савецкая Беларусь» патрабуе ад Вярхоўнага суду СССР суровага пакараньня агентаў сусьветнага імпэрыялізму з лягеру другога сацыял-здраднічага інтэрнацыяналу.

Заклятыя ворагі рабочае клясы—верныя слугі буржуазіі—меншавікі марылі сіламі міжнароднага імпэрыялізму затапіць у крыві рабочых і сялян першую ў сьвеце рэспубліку Саветаў.

Верны страж заваёў пралетарыяту, востры меч пралетарскай дыктатуры—АДПУ выкрыцьцём гэтай контр-рэвалюцыйнай групы меншавікоў, адсек яшчэ адну крывавую лапу сусьветнага імпэрыялізму, пасягаўшую на Краіну Саветаў.

Вітаючы АДПУ з новай перамогай на сваім слаўным пасьне, мы абавязваемся дружна дапамагаць АДПУ у правядзеньні ёю ўсіх яе мерапрыемстваў.

У адказ на крывавую контр-рэвалюцыйную шкодніцкую дзейнасьць агентуры другога сацыял-здраднічага інтэрнацыяналу—меншавіцкай групы Громанава і К-о, яшчэ мацней згуртуемся вакол ленінскай партыі і яе ЦК, узмоцнім барацьбу за выкананьне і перавыкананьне пляну трэцяга фашаючага году пяцігодкі, за ўзмацненьне абароназдольнасьці нашай краіны.

Няхай жыве камуністычная партыя, кіраўнік і арганізатар пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва і яе ленінскі ЦК!

Няхай жыве верны страж пралетарскай дыктатуры АДПУ!

ПОШТА-ТЭЛЕГРАМА

Усім ГК і РК КП(б)Б, гарсаветам і райвыканкомам

Праведзеная «Дэкада Штурму» у справе ліквідацыі няпісьменнасьці—патрэбных вынікаў не дала. Прарывы ў гэтай галіне застаюцца незліквідаванымі; такое становішча стварыла непасрэдную пагрозу зрыву дырэктыў партыі і ўраду на гэтым важнейшым вучастку культурнага будаўніцтва.

ЦК КП(б)Б і СНК БССР катэгарычна патрабуюць ад ГК і РК, гарсаветаў і РВК:

а) Забясьпечыць да 5-га сакавіка г. г. ахоп ліквпунктамі ўсіх рабочых, членаў прафсаюзаў, батракоў, калгаснікаў, дапрызыўнікаў, пераменьнікаў, членаў с-саветаў, дэлегатак, актыў да 45-гадовага ўзросту і ўсяго астатняга насельніцтва да 40-гадовага ўзросту, організаваўшы для гэтай мэты дадатковы лік патрэбных ліквпунктаў з такім разлікам, каб да 1-га мая г. г. ліквідаваць няпісьменнасьць насельніцтва памянёнага ўзросту.

б) Безадкладна ўкамплектаваць усе ліквпункты неабходнай колькасьцю ліквідатараў, мобілізаваўшы для гэтай мэты культармейцаў.

в) Прыняць рашучыя захады да забесьпячэньня ліквпунктаў патрэбнымі памяшканьнямі, абсталяваньнем, асьвятленьнем, апалам.

г) Дабіцца 100 проц. наведваньня няпісьменнымі ліквпунктаў, прымаючы да асоб, якія злосна не наведваюць ліквпункты, адпаведныя меры адміністрацыйнага ўплыву, праводзячы закол кожнага паасобнага выпадку выхаваўчую работу.

д) Работу ліквпунктаў увязаць з грамадзка-палітычным жыцьцём і правадзімымі партыяй і ўрадам гаспадарча-палітычнымі мерапрыемствамі.

е) Асоб, якія недаацэньваюць і зрываюць работу ў ліквпунктах, прыцягваць да адказнасьці.

ж) ЦК і СНК падкрэсьлівае аб персанальнай адказнасьці за выкананьне гэтай дырэктывы сакратароў партыйных камітэтаў і старшынь гарсаветаў і райвыканкомаў.

Сакратар ЦК КП(б)Б ГЕЙ.
Старшыня Савету Народных Камісараў ГАЛАДЗЕД

Сакратар ЦВК БССР—т. Гнілякевіч

Тав. Гнілякевіч Міхась Паўлавіч нарадзіўся ў Навагрудскім павеце ў 1892 годзе, па паходжаньню беларус, бацькі мелі 1,5 дзес. зямлі і ўвесь час батрачылі ў маёнтках абшарнікаў. У камуністычную партыю ўступіў у 1912 годзе.

З 9-гадовага ўзросту тав. Гнілякевіч пашоў у зарабаткі з пачатку падпаскам у маёнтку, а потым сталым сельгасрабочым.

З 1907 году да 1914 году тав. Гнілякевіч рабочы—сьлесар заводу гор. Пятэрбургу. З 1910 г. тав. Гнілякевіч член саюзу мэталістаў, у камуністычную партыю ўступіў у 1912 годзе ў гор. Пятэрбурзе.

1914—1916 год па дзень рэвалюцыі тав. Гнілякевіч быў на вайсковай службе ў якасьці радавога. Тав. Гнілякевіч прымаў актыўны ўдзел у лютаўскай рэвалюцыі ў гор. Петраградзе. Пасьля лютаўскай рэвалюцыі тав. Гнілякевіч да канца 1918 года працаваў на заводзе «Трэугольнік».

У лютым 1919 г. ЦК партыі камандыруе тав. Гнілякевіча ў Савецкую Беларусь, дзе ён з перапынкам на адзін год увесь час і працаваў. У 1919 г. тав. Гнілякевіч быў старшынёй вучастковай сьледчай камісіі і па даручэньню ЦК Літбел і 52 стралковай дывізіі вёў палітычную работу на перадавых пазыцыях вучастку Мір. У 1920 г. працаваў па арганізацыі саўгасаў і калгасаў у Калускай губ.

У канцы 1920 г. тав. Гнілякевіч працаваў у якасьці інструктара ЦБ КП(б)Б. У 1921 г. тав. Гнілякевіч быў членам калегіі Наркамзему БССР і галоўным кіраўніком саўгасаў і калгасаў Беларусі. З Кастрычніка 1921 года да 1927 г. тав. Гнілякевіч займаў шэраг адказных пасад па прафсаюзнай лініі: старшынёй ЦП Саюзу сельгасрабочых Беларусі, адначасова членам ЦК і членам прэзыдыуму ЦК саюзу сельгасрабочых, членам прэзыдыуму Савпрафбелу і некаторый час—адказным сакратаром ЦСПСБ (у 1926 г.). Член УсеЦСПС трох скліканьняў.

З 1921 году тав. Гнілякевіч увесь час член ЦВК БССР і адзін час быў кандыдатам у члены Прэзыдыуму ЦВК БССР.

У 1927 г. тав. Гнілякевіч быў камандзіраваны ЦК КП(б)Б на курсы марксызму пры Камакадэміі ў Маскве. Па сканчэньні курсаў першай Сэсіяй ЦВК БССР IX скліканьня тав. Гнілякевіч быў абран Наркомам Працы БССР. З мая 1930 г—член калегіі Наркампрацы СССР.

Тав. Гнілякевіч член ЦК КП(б)Б з 1924 г. за выключэньнем таго часу, калі вучыўся на курсах марксызму пры Камакадэміі.

На першай Сэсіі ЦВК БССР X-га скліканьня тав. Гнілякевіч абран Сакратаром ЦВК БССР.

Упаўнаважаным ЦК і СНК па мабілізацыі сродкаў

ЦК партыі прапануе застацца ў раёне на сакавік для правядзеньня месячніка мабілізацыі сродкаў.

Сакратар ЦК ШАРАНГОВІЧ.

Праверыць шэфства рабочых над дзяржапаратам

Пастанова Прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б

1. У ажыцьцяўленьне пастановы 3-га пленуму ЦКК КП(б)Б аб правядзеньні на працягу сакавіка месячніка праверкі і наладжаньня шэфства рабочых над дзяржапаратам, прэзыдыум ЦКК ПАСТАНАЎЛЯЕ:

а) правесьці сумесна з прафсаюзамі з 1 сакавіка па 1 красавіка месячнік праверкі і наладжаньня шэфства рабочых над дзяржапаратам;

б) правядзеньнем месячніка неабходна дабіцца рашучага ўзмацненьня масавага рабочага кантролю зьнізу—шэфства над усімі вучасткамі дзяржаўнага апарату і яго мабілізацыі на пасьпяховае выкананьне задач трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

2. Паставіць, як асноўную задачу месячніка:

а) папулярызацыю пастаноў ЦК і ЦКК УсеКП(б) ад 15 сакавіка 1930 году, XVI зьезду і ЦКК УсеКП(б) ад 23 сьнежня 1930 году па пытаньні аб рабочым шэфстве над дзяржапаратам сярод шырокіх рабочых мас і служачых савецкага апарату, мабілізуючы на ажыцьцяўленьне чарговых задач партыі і асабліва на выкананьне прам фінпляну і веснавой пасеўнай кампаніі;

б) праверыць становішча шэфства з мэтай уліку вопыту, які ёсьць, і галоўным чынам пашырэньня і арганізацыі рабочага шэфства над усімі зьвенямі дзяржаўнага і капэрацыйнага апарату як у гарадох, так і ў раёнах.

Уся работа павінна праходзіць на аснове самаспаборніцтва і ўдарніцтва і перанясеньня ўдарных мэтадаў работы з фабрык і заводаў у савецкі і на апэрацыйны апарат.

3. Для кіраўніцтва правядзеньнем месячніка стварыць пры ЦКК-РСІ, гарКК і райКК-РСІ (прамысловых раёнаў) штабы з прадстаўнікоў КК-РСІ (іх старшынства), парткомаў, прафсаюзаў, саветаў, камсамолу, рэдакцый газэт і саюзу саўгандлеслужачых.

Адказным за правядзеньне месячніка ад ЦКК НК-РСІ вылучыць тав. ГЕРШМАНА.

Даручыць кантрольным камісіям забясьпечыць мабілізацыю ўвагі партыйных і рабочых мас вакол разгортваньня шэфства, арганізаваць пад кіраўніцтвам штабаў рабочыя брыгады для правядзеньня праверкі і наладжаньня шэфства на фабрыках і заводах.

4. Скарыстаць месячнік для правядзеньня сіламі шэфскіх брыгад і шырокіх рабочых мас праверкі выкананьня вынікаў чысткі савецкага апарату, увязваючы яе з далейшым замацаваньнем і разгортваньнем шэфства.

5. Правесьці ў гарадох і раёнах да 5 сакавіка шырокія нарады ячэек, ФЗМК, кіраўнікоў устаноў і прадстаўнікоў друку па гэтым пытаньні.

6. Лічыць неабходным па сканчэньні месячніка паставіць даклады на прэзыдыуме ЦКК віцебскай, гомельскай і менскай гарКК аб выніках месячніка і становішчы шэфскай работы.

СТАРШЫНЯ ЦКК КП(б)Б КАЛНІН.

27 лютага, 1931 г.

Да новага прызначэньне тав. Хацкевіча

Народный камісар фінансаў

Хацкевіч, Александр Ісакавіч нарадзіўся ў 1895 годзе, па нацыянальнасьці—беларус, рабочы лесапільных заводаў, па паходжаньні з бедных сялян. У шэрагі Камуністычнай партыі ўступіў да Кастрычнікавай рэвалюцыі—у сакавіку 1917 году. Пры нямецкай акупацыі т. Хацкевіч за падпольную работу прасьледаваўся, падвяргаўся вобыскам і арышту.

Партыйна-савецкую працу ў Беларусі т. Хацкевіч пачаў з старшыні ячэйкі, валкому і валрэўкому; потым быў кіраўніком Павятовай Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі, Старшынёй Павятовага Рэвалюцыйнага Камітэту і адначасова быў Камандзірам Атраду Асобага Прызначэньня ў часы вайны з белапалякамі і бандытызму. З 1920 году на працягу пяці год т. Хацкевіч быў Старшынёй Павятовага і Акруговага выканаўчых камітэтаў (Барысаў, Магілёў). Затым пасьлядоўна т. Хацкевіч быў Народным Камісарам Унутраных Спраў БССР, Прадстаўніком БССР пры Урадзе СССР у Маскве, а потым на працягу чатырох год—Сакратаром ЦВК БССР.

У 1920 году т. Хацкевіч выбіраецца ў кіруючыя органы КП(б)Б; уваходзіў у склад першага пасьля белапольскай акупацыі Цэнтральнага Бюро КП(б)Б. Член ЦВК БССР і СССР усіх скліканьняў.

Тав. Хацкевіч мае шмат артыкулаў і друкаваных дакладаў па пытаньнях савецкага будаўніцтва і нацыянальнай палітыкі.

Па лініі грамадзкай тав. Хацкевіч зьяўляецца: Старшынёй ЦК Чырвонага Крыжу БССР, Старшынёй Таварыства марксыстых дзяржаўнікаў БССР і членам Бюро Усесаюзнай Асоцыацыі марксыстых дзяржаўнікаў СССР. Зараз тав. Хацкевіч састаіць членам Прэзыдыуму ЦВК СССР і кандыдатам у члены Бюро ЦК КП(б)Б.

На першай сэсіі ЦВК БССР X скліканьня т. Хацкевіч абран Народным Камісарам Фінансаў БССР.

З усёй рашучасьцю ўдарыць па апартуністычнай практыцы

Гомельскага і Нараўлянскага леспрамгасаў, якія зрываюць работу па загатоўцы і вывазцы лесу

На агідную хлусьню буржуазіі аб „прымусовай працы" ў СССР адкажам бальшавіцкім тэмпамі загатоўкі і вывазкі лесу дроў

УДАРНЫ МЕСЯЧНІК

па загатоўцы і вывазцы лесу і дроў у Гомельскім леспрамгасе ня даў пералому

Ударны месячнік абвешчаны 15-га студзеня, да гэтага часу ня ўнёс яшчэ сапраўднага пералому ў работу па лесазагатоўках і вывазцы ў Гомельскім леспрамгасе.

Вурокі асобнага кварталу, плян якога фактычна быў сарваны, ні чаму не навучылі Гомельскі леспрамгас; нізавыя партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі да гэтага часу не перабудаваліся па-ўдарнаму і ня здолелі мабілізаваць рабочых. Вынікі студзеньскіх загатовак дроў і вывазкі сьведчаць аб недадушчальнай нядбайнасьці вучлесгасаў і самаго леспрамгасу, да лесазагатовак і вывазкі.

Дзе-ж прычына надзвычайна нізкіх тэмпаў лесазагатовак і вывазкі ў асобным квартале, у студзені і ў першай дэкадзе лютага? Гэта прычына—ў незабясьпечанэньні гужслай. Але хто ў гэтым вінаваты, калі ня сам леспрамгас, райком, сельсаветы. Зразумелая рэч, што недахоп рабочых мае месца ня столькі з прычыны іх адсутнасьці, сколькі ад таго, што завербаваныя рабочыя і возчыкі ня ўсе выходзяць у лес. Напрыклад, у студзені і лютым павінна было працаваць 10.000 падвод, а працавала ўсяго ад 2.000 да 3.700 падвод.

Галоўная і асноўная бяда яшчэ ў цяперашняй кучасьці рабочай сілы: лесарубы і возчыкі прыходзяць у лес на 2-3 дні, адыходзяць і зноў вяртаюцца. Пры гэткай расхлябанасьці цяжка гаварыць аб выкананьні плянаў лесазагатовак і вывазцы.

Нізкая прадукцыйнасьць працы

Другая прычына неадвальняючага ходу лесазагатовак гэта нізкая прадукцыйнасьць працы, дрэнная арганізацыя работ і адарванасьць гаспадарні каў і прафсаюзаў ад лесу, лесарубаў і возчыкаў. Абежнікаў і пастаноў напісана шмат, але жывога сапраўднага кіраўніцтва няма. Калі ўзяць работу Ленінскага вучлеспрамгасу, дык загатоўка дзелавой драўніны выканана на 108 проц.; па загатоўцы дроў замест таго, каб загатаваць 30.000 раўмэтраў, яны загатавалі ўсяго 7.924 р. м.; па вывазцы: замест 28.922 к. м. дзелавой драўніны, вывезена 6.354 к. м.; замест 25.000 р. м. дроў—вывезена 8.841 р. м. Кажучы інакш плян па загатоўцы дроў выкананы на 30 проц., а па вывазцы на 35 проц.

Макееўскі вучлеспрамгас і да гэтага часу ня сходзіць з чорнай дошкі. Прыкладна, па загатоўцы дзелавой драўніны замест 38.431 км.—загатавана 30.248 к. м.; экспорту—замест 1.013 к. м.—загатавана 244 к. м.; дроў замест 49.000 р. м.—загатавана ўсяго 7.652 р. м.

Па вывазцы — замест 41.596 к. м. дзелавой драўніны—вывезена — 6.006 к. м.; экспарту—замест 1013 к .м.—вывезена 191 к. м.; дроў замест 42.500 р. м.—вывезена 407 р. м.

Райком саюзу і гаспадарнікі, добра ведаючы работу Макееўскага вучлеспрамгасу, ня штурмуюць яго па-бальшавіцку, не арганізуюць там брыгады і не стараюцца палепшыць работу ў гэтым вучастку.

Маркавіцкі вучлеспрамгас оваё заданьне па загатоўцы дзелавой драўніны, праўда, перавыканаў на 15 проц., але па ўсіх іншых галінах работы адстае. Загатоўка экспарту: замест 1.168 к. м. выканана 746 к. м.; дроў замест 20.000 р. м. — выканана—8.343 р. м. Вывазка: замест 28.229 к. м. дзелавой драўніны выканана 10.254 к. м.; экспарту—замест 1168 к. м.—выканана 667 к. м.; дроў — замест 12.000 р. м. выканана 2.072 р. м.

Добрускі вучлеспрамгас мае здаваль няючы паказьнік па загатоўцы экспарту; замест даната яму заданьня ў колькасьці 1.825 к. м., ім загатавана 2.740 к. м.

Дзелавой драўніны загатавана; замест 59.758 к. м., 50.182 к. м.; дроў—замест 50.000 р. м.—12.476

Вывазка праходзіць чарапашымі тэмпамі

Дрэнная справа з вывазкай па Добрускім вучлеспрамгасе. Ня гледзячы на тео, што возчыкаў у іх маецца 842 пад воды, у рабоце вучлеспрамгасу маюцца вялікія прарывы. Напрыклад: замест 61.402 к. м. дзелавой драўніны—вывезена 11.588 к. м.; экспарту—замест 1.825 к. м.—вывезена 943 к. м.; дроў—замест 40.000—вывезьлі 4.423 р. м.

Па Шабрынскім вучлеспрамгасе заданьне па вывазцы дзелавой драўніны выканана на 102 проц., але па экспарце—замест 1.269 к. м. вывезена ўсяго—410 к. м.; дроў—замест 32.000 р. м.—17.293 р. м.

Пры 1.085 падводах у Шабрынскім вучлеспрамгасе, плян мог быць бы цалкам выкананы, але на справе ў іх агідны прарыў. Дзелавой драўніны яны ня вывезьлі 29.008 к. м.; экспарту—недавыканана 80 проц.; дроў—недавывезена 18.000 р. м.

Па Веткаўскім вучлеспрамгасе заданьне па загатоўцы дзелавой драўніны выканана на 106 проц., па дровах замест 13.000 р. м.—выканана 5.844 р.м.

Замест 25.930 к. м., дзелавой драўніны вывезена 8.541 к. м.

Шараўскі вучлеспрамгас сваё заданьне па загатоўцы дзелавой драўніны выканаў толькі на 90 проц.; дроў, замест 30.000 р. м., загатоўлена 16.285 р.м.

Замест 10.525 ф. м., дзелавой драўніны вывезена 703 ф. м.; дроў—замест 25.000 р. м.—вывезена 6.004 р. м.

Лепш за ўсё працуе Астроўскі вучлеспрамгас. Ён мае лепшыя паказьнікі ў параўнаньні з іншымі вучасткамі; ён ужо выканаў па дзелавой драўніне 81 проц. гадавога заданьня і па загатоўцы дроў 62 проц. гадовага заданьня.

Па вывазцы-ж плян ад гадавога заданьня па дзелавой драўніне і па дровах выкананы на 47 проц.

Трохкутнік ня здолеў кіраваць

Ганебны прарыў па Гомлеспрамгасе за асобны квартал, студзень і першую дэкаду лютага здарыўся таму, што кіраўніцтва Гомлеспрамгасу, партыйныя прафэсыянальныя і гаспадарчыя арганізацыі аказаліся ня здольнымі скарыстаць актыўнасьць рабочых мас, пабальшавіцку арганізаваць іх і стаць на чале для пасьпяховага выкананьня праграмы лесазагатовак і вывазкі лесу і дроў.

Слаба вялася масавая, палітычна-выхаваўчая работа сярод рабочых у лесе, гэта ўсё гаворыць аб тым, што кіраўніцтва Гомлеспрамгасу ня справілася са сваімі задачамі, ня здолела ісьці ў ногу з агульнымі задачамі сацыялістычнага будаўніцтва.

Старае кіраўніцтва райкому саюзу лесдрэў, за апартунізмам з работы зьнята, але ніхто ня думае аб новым кіраўніцтве.

Што патрэбна, каб забясьпечыць выкананьне пляну

Каб забясьпечыць выкананьне пляну, па-першае, трэба праверыць выкананьне самаабавязацельства аб выхадзе ў лес, па-другое, спыніць цякучасьць рабсілы, перабудаваць масавую работу і культурна-бытавую работу, перанесшы яе ў лясную хату. У кожным вучлеспрамгасе неабходна арганізаваць ня менш 3-х брыгад, давёўшы плян да кожнай брыгады, арцелі і лесаруба, мабілізаваць масы на выкананьне пляну, выдучы рашучае наступленьне на кулацкія элементы.

Інтарэсы пасьпяховага выкананьня праграмы трэцяга рашаючага году пяцігодкі патрабуюць неадкладнага ўзмацненьня партыйнага, прафэсыянальнага і гаспадарчага кіраўніцтва Гомлеспрамгасу. Неабходна таксама пераглядзець кіраўніцтва ў паасобных вучлеспрамгасах.

Гомельскі Гарком партыі павінен накіраваць некалькі моцных камуністаў на работу ў леспрамгас, практычна дапаматчы Гомлеспрамгасу ў выкананьні і перавыкананьні пляну лесазагатовак.

Е. Худыш.

Фізкультуру—на службу сацыялістычнага будаўніцтва

3-га сакавіка а 9 гадзіне ўвечары ў Менску на Пляцу Волі будзе дан старт удзельнікам Усесаюзнай, у 4½ вай эстафеты Заряда здароўя ворачных рэфэты «Труд і Абарона СССР» у гонар VI Зьезду Саветаў Саюзу ССР па маршруту Менск—Масква.

Усесаюзная эстафэта, як мы пісалі, раней, зьяўляецца вялікім грамадзка-палітычным мерапрыемствам, якое ставіць асноўнай сваёй задачай збор і дастаўку VI Зьезду Саветаў Саюзу ССР рапартаў фабрык, заводаў, калгасаў і іншых грамадзкіх арганізацый Савецкага Саюзу аб іх дасягненьнях у выкананьні плянаў 3-га рашаючага году пяцігодкі, як у прамысловасьці, так і ў сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і іх гатоўнасьці да абароны краіны Саветаў.

Усесаюзная эстафэта «Труд і абарона», якая праводзіцца ВСФК СССР і ЦС ТДА-Авіахіму, зьяўляецца ваенізаваным мерапрыемствам з асноўнай ўстаноўкаю на лыжы (фізычнае загартаваньне, вытрыманасьць, дакладнасьць і г. д.); яна ставіць сваёй мэтай садзейнічаньне масаваму ўцягненьню працоўных у дабраахвотную вайскова-вучэбную работу ў арганізацыях ТДА-Авіахіму, уздым якасьці работы ТДА-Авіахіму і фізкультурнага руху на поўнае падпарадкаваньне апошніх задачам абароны краіны ў зьвязку з пагрозай вайны супроць Савецкага Саюзу.

На ўдзельніках Усесаюзнай эстафэты ад БССР як і на ўдзельніках іншых маршрутаў Савецкага Саюзу ляжыць вялікая адказнасьць па выкананьні мэтаў і задач пад, лёзунгам якіх праходзіць гэтая эстафэта. Гэта работа ў асноўным павінна праводзіцца з пункту гледжаньня папулярызацыі рашэньняў аб'яднанага сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) і студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б, рашэньняў X Усебеларускага Зьезду Саветаў і задач надыходзячага VI Усесаюзнага Зьезду Саветаў па ўзмацненьні работы мясцовых савецкіх органаў, па мабілізацыі мас на ўдарнае выкананьне прамфінпляну, на баявую падрыхтоўку да другой бальшавіцкай сяўбы, на узмацненьне абароназдольнасьці краіны, на справу перабудовы работы саветаў, фізкультурных і ТДА-Авіахімаўскіх арганізацый, на рашучую барацьбу з адхіленьнямі ад генэральнай лініі партыі.

Характэрным ва Ўсебеларускай эстафэце зьяўляецца тое, што цяпер, як ніколі раней, была мабілізавана навакол ролі і значэньня і ўдзелу ў эстафэце шырокая пролетарская грамадзкасьць і масы фізкультурнікаў. На ўсіх этапах гэтай эстафэты удзельнічала звыш 3.000 чал. фізкультурнікаў з ліку рабочых-ударнікаў, вайсковых часьцей, калгасьнікаў і беднаты. Беларуская эстафэта абярнулася ў рапарт мільёнаў X Зьезду Саветаў. Удзельцы выпісменасьці, але ні аднаму праз лыжнікаў перададзена звыш 300 рапартаў фабрык, калгасаў з розных куткоў Беларусі аб іх посьпехах у выкананьні плянаў 3-га рашаючага году пяцігодкі і гатоўнасьці к абароне краіны. Удзельнікамі эстафэты праведзены звыш 500 сходаў у калгасах, саўгасах па пытаньнях калектывізацыі, падрыхтоўкі да вясновай сяўбы, па пытаньнях ваенізацыі, перабудовы і ўзмацненьня фізкультурнага і ТДА-Авіахімаўскага руху ў БССР. Гэтымі сходамі абслужана каля 20.000 працоўнага сялянства і калгасьнікаў. Удзельнікамі эстафэты арганізавана 9 калгасаў і ўцягнута ў існуючыя калгасы каля 50 індывідуальных сялянскіх гаспадарак. Арганізавана 43 фізкультурных гурткі і 343 ячэйкі ТДА-Авіахіму, распаўсюджана звыш 1000 білетаў 5-й Усесаюзнай Лётарэі ТДА-Авіахіму і праведзена сярод сялянства падпіска на пазыку 3-га рашаючага году пяцігодкі на 1300 рублёў.

Неабходна канстатаваць, што ў час правядзеньня сходаў у вёсках назіраліся выпадкі вылазак клясавага ворага (кулакоў, адкрыта выступаючых супроць плянаў другой бальшавіцкай сяўбы). Гэтыя вылазкі з боку працоўнага сялянства сумесна з удзельнікамі эстафэты ўсюды атрымлівалі пралетарскі адпор.

Гэтыя папярэднія вынікі Усебеларускай лыжнай эстафэты зьяўляюцца вынікам перабудовы фізкультурнага руху ў суадпаведнасьці з дырэктывамі партыі і ўраду на грунце падпарадкаваньня апошняга задачам сацыялістычнага будаўніцтва і абароназдольнасьці краіны. Усебеларуская лыжная эстафэта зьяўляецца адным з асноўных галін падрыхтоўкі да Ўсесаюзнай эстафэты «Труд і абарона». Вынікі грамадзка-палітычнай работы, праробленай ў час Ўсебеларускай эстафэты, павінны быць замацаваны, падвоены і патроены ўдзельнікамі ад БССР на Ўсесаюзнай эстафэце і толькі пры гэтых умовах БССР зможа выканаць узятыя на сябе абавязкі па выкананьні мэт і задач Усесаюзнай эстафэты.

Фізкультурны і ТДА-Авіахімаўскі рух у БССР павінен яшчэ больш развівацца на аснове масавасьці і сапраўднага павароту тварам да вытворчасьці, калгасаў і насыщэньні ўсёй практычнай работы элемэнтамі вайсковай падрыхтоўкі.

Кожны фізкультурнік павінен быць ударнікам у справе выкананьня пяцігодкі за чатыры гады.

Траскоўскі.

Сельскія саветы і ўзмацненьне абароназдольнасьці СССР

Судовы працэс «прампартыі», выкрытая агідна-здрадніцкая дзейнасьць беларускіх нацдэмаў Лёскаў, Некрашэвічаў, Смолічаў і інш., «Саюзнага бюро» РСДРП (меншавікоў), а таксама па дарожжа дыктатара фашысткай Польшчы Пілсудзкага ў Парыж, Лёндан і абвешчаная ў «Праўдзе» заява французкага палітычнага дзеяча Брыяна на пан-эўропэйскай канфэрэнцыі пацьвярджаюць аб шалёнай падрыхтоўцы за межнай буржуазіі і нашай унутранай контр-рэвалюцыі да новага нападу на краіну Саветаў.

Гэтыя трывожныя сыгналы высоўваюць перад сельскімі саветамі БССР, як аванпостам нашага Саюзу, надзвычайна адказныя задачы. Сельскія саветы ў сваёй рабоце павінны зьвярнуць асаблівую ўвагу калгасьнікаў беднякоў і сераднякоў на ўзмацненьне абароназдольнасьці СССР. Праводзячы палітыку міра, наша партыя і савецкая ўлада ўскладаюць на сельскія саветы абавязкі праз усе рычагі грамадзкасьці дапамагаць Чырвонай арміі ўмацоўваюць сваю баяздольнасьць, замацоўваць гатоўнасьць усіх працоўных стаць сталёвай сьцяной на абарону Кастрычнікавых заваёў.

Сельсаветы ў першую чаргу павінны зьвярнуць асаблівую ўвагу на поўнае выкананьне і перавыкананьне заданьняў па ўсіх гаспадарча-палітычных кампаніях, а таксама на арганізацыю новага масавага прыліву ў калгасы праз сталую падрыхтоўку да другой калгаснай вясны кожнага саўгасу, кожнага калгасу, кожнага сельска-гаспадарчага вытворчага аб'яднаньня, кожнага двара бедняка і сераднякa аднаасобнікаў—заўтрашніх калгасьнікаў. Гэта забясьпечыць выкананьне праграмы 3-га рашаючага году пяцігодкі, і перавыкананьне яе, гэта будзе ўзмацняць нашу абароназдольнасьць.

Сельсаветам неабходна мабілізаваць усю савецкую грамадзкасьць на вёсцы, каб зараз-жа прыступіць да загатоўкі неабходнага матар'ялу для пабудовы новых і рамонту старых мастоў і грэбляў, каб гэтым самым даць магчымасьць у мірны час захоўваць ад псаваньня транспарт і жывёлу, каб у выпадку патрэбы мець добрыя дарогі.

Поўнае правядзеньне ў жыцьцё пералічаных мерапрыемстваў будзе найлепшым узмацненьнем абароназдольнасьці краіны саветаў і баяздольнасьці нашай РСЧА.

Для практычнага ажыцьцяўленьня апошняй задачы сельскія саветы павінны дапамагчы ячэйкам Асаавіяхэму ўлічыць наяўнасьць на іх тэрыторыі камандна-палітычнага складу запасу і яго скарыстаньню.

Сельскія саветы павінны ўсямерна дапамагчы ячэйкам Асаавіяхэму адшукаць адпаведныя сродкі для набыцьця патрэбных прылад і работы, дапамагчы арганізаваць гэктары абароны ў калгасах. Разам з тым сельсаветы павінны зьвярнуць асаблівую ўвагу на прадстаўленьне памяшканьняў для ваеннай работы, на рамонт і абсталяваньне вучэбных пунктаў і на дапамогу правесьці зборы і арганізацыі міжзборавай работы.

Праведзеная нядаўна «дэкада абароны» паказала, што яна па ўсім нашым Саюзе вылілася ў масутную дэманстрацыю гатоўнасьці працоўных мас да абароны краіны саветаў ад усіх інтэрвентаў звонку і варожых элемэнтаў унутры.

Гэтую баявую гатоўнасьць рабочых мас, калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў сельскія саветы павінны штодзень ўзмацняць, і ў дзень юбілею XIII гадавіны Чырвонай армії і пасьля яго работу ў гэтым напрамку паставіць так, каб праз арганізаваную калгасную работу, тэхнічнае аснашчэньне саўгасаў, калгасаў, разгортваньне палітычнай і культурнай работы ператварыць калгасы і саўгасы ў апорныя пункты абароны.

Байкаш.

Ачысьціць Нараўлянскі леспрамгас ад чужых элемэнтаў

Апошнія зьвесткі аб ходзе лесазагатовак і вывазцы лесу, па Нараўлянскім раёне гавораць аб іх катастрафічным становішчы. Гадавое заданьне па будаўнічым матар'яле выканана на 14,05 проц., па дровах на 3,7 проц. За отудзень месячнае заданьне па будаўнічым матар'яле выканана на 4,5 проц. і па дровах—на 3,5 проц. Раённыя арганізацыі не мабілізуюць сябе на гэту ўдарную работу, ня прымусілі кулака і заможніка выканаць цьвёрдыя заданьні, не арганізавалі калгаснай беднаты.

Апрача таго, ўвесь апарат Леспрамгасу засьмечан пазбаўленцамі, вычышчанымі з савапарату, былымі лясьнымі пузамі лесапрамысловцамі. Тут знашлі прыпулак сабе Шухманы - Лельчукі, так званыя «спэцы».

Пагалоўнае п'янства ў Нараўлянскім вучлесгасе з дырэктарам Пракапенкам на чале, разбазараваньне сотнямі мэтраў мануфактуры і пудамі мыла—рось дзейнасьць гэтага вучлесгасу.

Пракаўтае сваяцтво і кумаўство. Дырэктарам Пракапенкам за ўзнагароду футрам прымаецца на работу буйны спэкулянт Калесьнікаў.

Непаладкі, лаянкі, падзел на «наркамзем аўцаў» і «лесбелаўцаў», вярбоўка на свой бок людзей па бутэльцы»,—вось «права» у Нараўлі.

Распараджэньні старэйшага дзеяўніка т. Аппаранкі адменьваюцца дырэктарам Пракапенкам, што досыць страты дзяржаве да 9 тыс. руб.; ці-ж гэта не мяжуецца са шкодніцтвам?

Разгул антысэмітызму і яўрэйскага шавінізму, спрыяюць выжываньню «не патрэбных» людзей, як Аппаранка. Гэтыя «вярхішкі» спраў Іван Іванавічы, Джыгітаўскія, Пракапенкі, Гуркіны, Лінскія, Пераходы і інш. з музэю «мінулых», людзі абноўленага аппарата павінны былі на справе выконваць ролю і ідэі партыі.

Гэтая кучка разлажыўшыхся здраднікаў стаяла перашкодай на шляху выкананьня бальшавіцкіх плянаў. Камуністы-кіраўнікі палкам даверыліся ашуканцам, «спэцам», плылі па іх цячэньні, фактычна ня ведаючы добра характару сваёй справы, ня прымаючы своячасова рашучых мер, баючыся «сапсаваць адносіны».

Райком СГЛР пры Ельскім Леспрамгасе са сваімі работнікам ня сталі на чале рабочых мас, не мабілізавалі рабочых, не разгарнулі крытыкі і самакрытыкі, чым магулі-б таксама папярэдзіць гэтае разлажэньне.

Райком СГЛР фактычна спрацўў свой твар.

90 проц. экспартнага і 60—70 проц. агульнага лясного масыву знаходзіцца ў Нараўлянішчыне, Ельскага леспрамгасу. Гэтыя лічбы ня могуць прымусіць цьвердалобых падумаць над пытаньнем аб ужыцьці рашучых захадаў для выкананьня пляну.

Спыніць пустыя гутаркі аб падрыхтоўцы кадраў; трэба рэальна, практычна вырашыць пытаньне аб падрыхтоўцы кадраў, ачысьціцца ад непатрэбных нам людзей; партарганізацыям заняцца сыстэматычным уделам і кіраўніцтвам лясьнымі работамі, вылучаючы сыстэматычна лепшых работнікаў-камуністаў.

Неабходна ачысьціць апарат леспрамгасу. Прафсаюзы павінны арганізаваць яшчэ больш рабочую масу на ліквідацыю прарываў, разьвіць сацыялістычныя мэтады працы—сапсаборніцтва, ўдарніцтва і г. д. Разгарнуць культмасавую работу з такім разьлікам, каб больш ахапіць раскіданых па лесе рабочых. Узяць курс і рашуча вылучыць праверанных на справе лепшых ударнікаў-рабочых на кіруючую работу. Камуністам-кіраўнікам неабходна вывучыць сваю вытворчасьць аўладаць тэхнікай, вывучыць і ведаць сваю работу.

Шульман Б.

Скарыстаць санную дарогу

Аб чым даводзяць нам лічбы выкананьня лесазагатоўчага пляну па БССР на 11 лютага? Калі з загатоўкай дзелавой драўніны справа стаіць большменш здавальняюча, бо на 11-II—31 г. загатоўлена 46,7 проц. квартальнага заданьня, дык з загатоўкай дроў справа стаіць зусім дрэнна—загатоўлена толькі 14,5 проц.

Вывазка дае ганебныя лічбы. На 11-II вывезена дзелавой драўніны толькі 21,3 проц. квартальнага заданьня, г. зн. толькі 1.092.335 к-м, пры заданьні 5.129.000 к-м, у той час калі патрэбна было вывезьці за гэты час ня менш 3.000.000 к-м.

Дроў вывезена толькі да чыгунак і сплаўных пунктаў 945.487 раўмэтраў, пры квартальным заданьні 4.210.170 к-м, гэта значыць 22,4 проц.

Тэмп вывазкі супроць астатняй дэкады мала павялічыўся.

Нарада пры СНК БССР канстатавала, што плян лесазагатовак знаходзіцца пад пагрозай зрыву і прапанавала Лесбелу і РВК ужыць шэраг захадаў. Аднак Лесбел да гэтага часу ня выканаў пастановы Саюзлесправу аб мабілізацыі адказных працаўнікоў да канца лесазагатовак на раёны.

Зараз, толькі пры сапраўднай напружанасьці ўсёй грамадзкасьці, можна плян лесазагатовак і вывазкі за час саннай дарогі выканаць.

П. К—скі.

ПАСТАНОВА

Бюро ЦК ЛКСМ 28-II 31 г. аб палітычнай памылцы газэты „Чырвоная Зьмена"

1. Адзначыць, што пры агульна-правільнай палітычнай лініі газэты «Чырвоная Зьмена» ў прыватнасьці ў пытаньнях асьвятленьня на старонках газэты пытаньняў міжнароднага рэвалюцыйнага руху «Чырвоная Зьмена» дапусьціла палітычную памылку ў крытычнай заметцы ад 26,II—31 г. аб газэце «Рабочий», на гэту памылку «Чырвонай Зьмены» газэта «Зьвязда» і «Рабочий» ад 27-II—далі правільную крытыку.

«Чырвоная Зьмена» падвяргаючы крытыцы загалоўкі ў газэце «Рабочий» ад 25-II—31 г. няправільна характарызавала сучасны міжнародны рэвалюцыйны рабочы рух, кажучы аб тым, што зараз пры наступленьні капітала на рабочую клясу адсутнічае контр-наступленьне пролетарыяту на капітал, адарвала самаабарону рабочых ад контр-наступленьня, ня даўшы глыбокага марксыцка-ленінскага аналізу сучаснаму міжнароднаму становішчу. Гэтым самым няправільна арыентавала арганізацыю ЛКСМБ і савецкую грамадзкасьць на пытаньні сучаснага міжнароднага рэвалюцыйнага руху, што супярэчыць рашэньням XVI Зьезду УсеКП(б) аб тым, што:

«Пралетарыят адказвае на наступленьне капіталу разьвіцьцём стачачнага руху, выступленьнямі безпрацоўных, політычнымі дэманстрацыямі пры наяўнасьці элемэнтаў, перарастаньнем эканамічных баёў у баі палітычныя. Працякаючы ва ўмовах рэвалюцыйнага ўздыму сусьветнага рабочага руху і рэвалюцыйных мас калёній, які ўжо пачаўся крызіс уздымае на больш высокую ступень контр-наступленьне пралетарыяту, вядучы да перарастаньня ў некаторых краінах крызісу эканамічнага ў крызіс палітычны і паскарае разьвязваньне грамадзянскіх войн у калёніях».

Бюро ЦК ЛКСМБ расцэньвае дапушчаную палітычную памылку «Чырвонай Зьмены» як права-апартуністычную.

2. Прыняць да ведама заяву рэдактара «Чырвонай Зьмены» т. Платэна аб прызнаньні дапушчанай палітычнай памылкі.

3. Прапанаваць рэдакцыі газэты «Чырвоная Зьмена» даць на старонках газэты крытыку сваёй памылкі, а так сама больш сыстэматычна асьвятляць пытаньні міжнароднага рэвалюцыйнага рабочага руху.

4. Пастанову апублікаваць у друку

Дэкада праверкі падрыхтоўкі да вясны

ПРАВЯРАЕМ ГАТОЎНАСЬЦЬ ДА СЯЎБЫ!

Дэкада праверкі павінна стаць паходам мільёнаў за поўнае выкананьне і перавыкананьне

праграмы веснавой сяўбы, за арганізацыю калгаснага прыліву, за 100-процантную кантрактацыю ярыны. Раёны! Уключайцеся ў сацспаборніцтва на лепшую падрыхтоўку і правядзеньне веснавой сяўбы! Змагайцеся за ганаровы сьцяг X усебеларускага зьезду саветаў!

Мазырскі прамтрэст ня выканаў заказу

Рамы павінны быць!

Белсадгародсаюз павінен сёлета ў веснавы пэрыяд залажыць 46.100 парніковых рам, каб забясьпечыць прамысловыя цэнтры раньняй гароднінай. Для гэтай мэты яшчэ ў кастрычніку мінулага году была заключана ўмова з Мазырскім Прамтрэстам на выраб 25.000 шт. парніковых рам.

Ня гледзячы на тое, што ўжо трэба пачынаць закладку парнікоў заданьне па вырабу рам выканана толькі на 50 проц.: замест 25.000 зроблена толькі каля 13.000 рам. Калі будуць зроблены астатнія рамы—невядома. Калі работа будзе працягвацца і надалей такімі тэмпамі, дык рамы будуць зроблены не раней восені. Гэта значыць, з аднаго боку зрыў мерапрыемстваў па забесьпячэньні прамысловых цэнтраў раньняй гароднінай, з другога боку—на працягу амаль цэлага году будзе ляжаць мертвым капіталам вялікая колькасьць парніковых рам, якія не дадуць ніякай карысьці.

Вось чаму трэба зараз-жа паставіць на баявыя тэмпы выраб парніковых рам на заводзе Мазырскага Прамтрэсту. Трэба дабіцца, каб Прамтрэст поўнасьцю выканаў дагавор па вырабу ўсіх 25.000 рам у самы кароткі час.

З другога боку, мы сустракаемся з недапушчальнымі фактамі бюракратызму, і нядбайнасьці ў адносінах да адгрузкі ўжо гатовых рам. На ст. Мазыр ляжыць да 4 тысяч рам, і начальнік станцыі зусім не сьпяшаецца з іх адпраўкай.

Некаторыя райкалгассаюзы таксама праявілі поўную бястурботнасьць у адносінах да арганізацыі парнікоў. Ніхто з іх нават не клапоціцца аб тым, каб своячасова зрабіць скрынкі для набіваньня гною. Ня былі ўжыты зэхады для водпуску патрэбных лясных матар'ялаў.

Мы сыгналізуем аб тым, што ў справе падрыхтоўкі да парніковай кампаніі маецца прарыў. На ліквідацыю гэтага прарыву трэба зараз-жа мабілізаваць усю грамадзкасьць. Трэба дабіцца, каб парнікі былі закладзены своячасова і ў вызначаный колькасьці.

Г. П.

Б'ём трывогу

Па Дрыбінскім раёне не праводзіцца амаль ніякай работы па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы. Масы зусім не мабілізаваны на правядзеньне гэтай кампаніі.

Сельска-гаспадарчыя машыны не рамонтуюцца. Існуючыя кузьні не напружаны поўнасьцю і займаюцца зусім іншаю работаю.

Да вывазу фасфарытнай муки з Каробчына адносяцца нядбайна. Ня ўсе калгасы вывезьлі сваю частку ўгнаеньня, ня гледзячы на тое, што хутка пасеецца дарога. Ня вывезена таксама ніводнага кілё вапны. Плян вапнаваньня глебы па Дрыбінскім раёне знаходзіцца пад патрозай зрыву.

Ачыстка насеньня праходзіць нездавальняюча. Толькі Райкаапсаюз і частка калгасаў ачысьцілі сваё насеньне, аднаасобнікі-ж зусім не ачышчаюць. Засыпка насенных і страхавых фондаў праводзіцца часткова па старых калгасах; страхавыя фонды па індывідуальным сэктары зусім не ствараюцца.

Браніроўка кармоў для веснавых работ, амаль што не праводзіцца. У некаторых калгасах нават не хапае грубых кармоў (калгас «Новы Сьвет»); не хапае корму ў некаторых сьвінагадоўчых калгасах (камуна «Майскі дзень» і інш.).

Зусім не пачата падрыхтоўка да будаўніцтва ў калгасах. Вывад лесаматар'ялаў для пабудовы сьвінарнікаў яшчэ не пачаты; ёсьць калгасы, якія яшчэ не адрымалі нават і лесу.

Дрыбінскія арганізацыі павінны зараз-жа пераключыць сваю работу па падрыхтоўцы да сяўбы на ўдарныя тэмпы.

Брыгада: Сайфудзін, Старыкоў.

Рыхтуемся па ударнаму

Падрыхтоўка да веснавой сяўбы калгас «Інтэрнацыянал», Буда-Кашалёўскага раёну, пачаў своячасова. Плян сяўбы яшчэ ў студзені быў даведзены да кожнага калгасьніка. Калгас абвясьціў сябе ўдарным і выклікаў на сацспаборніцтва калгас «Камінтэрн».

У мінулым годзе калгас ня меў сталага севазвароту—сеялі дзе папала. Зараз гэта ўлічана. У калгасе устаноўлен адзінацыяцыпольны севазварот; значная частка зямлі адводзіцца пад пасеў траў і кораньплодаў, прымаючы пад увагу тое, што калгас мае малочна-жывёлагадоўчы напрамак.

У параўнаньні з мінулым годам, прадугледжваецца пашырэньне пасеўнай плошчы на 75 га за кошт раскарчовак і аблогаў. Сёлета намечана пасадзіць 5 га саду, арганізаваць 10 га прамысловых агародаў больш як 12 га спажывецкіх гародаў. Сіласных культур намечана засеяць 32 га, кораньплодаў—42 га, вікі—48 га, канюшыны—73 га.

Насенным матар'ялам зернавых культур калгас амаль поўнасьцю забясьпечан. Не хапае толькі насеньня траў: сэрадэлі, лубіну, канюшыны і вікі.

Насеньне ачышчаецца. Прыступлена да рамонту с-г. інвэнтару.

На 1931 год намечана значнае будаўніцтва: вызначана пабудаваць два жылых памяшканьні, народны дом, дзьве стайні, дзьве аборы, цялятнік, сьвінарнік, лазьню, намечана пашырыць цагэльню з давядзеньнем выпуску цэглы да 2.000.000 шт., намечаецца пашырэньне чарапічнай майстэрні, каб поўнасьцю забясьпечыць калгас будаўнічым матар'ялам.

Узорная падрыхтоўка да веснавой сяўбы калгасам «Інтэрнацыянал» выклікала прыліў у калгас за кошт бядняцка-серадняцкіх мас. Гэтымі днямі ў калгас уступіла яшчэ 6 новых гаспадарак.

Ф. Шульман.

Ліквідаваць прарывы спэцыялізацыі раёну

Барысаўскі раён зьяўляецца раёнам малочна-жывёлагадоўчым. Ня гледзячы на гэта маюцца вялікія прарывы ў працы па спэцыялізацыі раёну.

Плян будаўніцтва па сыстэме Райкалгассаюзу выканан усяго на 21 проц.

Па саўгасу Весялова плян будаўніцтва выканан на 30 проц. Па саўгасу Сержпутова—на 40 проц., па саўгасу Палелюм—на 30 проц.

Тэхнагляд за будаўніцтвам цалкам адсутнічае.

Выкананьне пляну па ўкамплектаваньні спэцыялізаваных жывёлаводчых калгасаў і саўгасаў з боку загатоўчых арганізацый праходзіць чарапашымі тэмпамі. Па ўкамплектаваньні сьвінамат'ямі, Райкалгассаюзам плян выканан усяго на 39 проц. Па рагатай жывёле плян выканан на 49 проц.

Маюцца масавыя выпадкі нядбайных і беагаспадарчых адносін да ўтрымання стада. Адсутнічае вэтэрынарны і санітарны нагляд, у выніку чаго маюць месца хваробы ската і сьвіней. Сьвіней прымаюць без карантына і стаўляць у агульнае стада. У калгасе «РОЙ»—пала 147 штук маладняку і 14 сьвінаматак.

У рамонтнай майстэрні с-г інвэнтару і машын.



Праверка трактара.

Случчына павінна ліквідаваць прарыў

Падрыхтоўка да веснавой сяўбы па Слуцкім раёне яшчэ належна не разгарнулася. На гэтым фронце ёсьць шмат прарываў, якія трэба ліквідаваць у самы бліжэйшы час.

Плян зерначачыстак выкананы па калгасах на 25 проц., у аднаасобнікаў—на 3 проц. Па некаторых сельсаветах нават не абгаварваліся на сходах пляны сяўбы (Алегавіцкі сельсавет). У Каловіцкім сельсавеце паўтары месяцы пляны сяўбы трымалі ў габінэтах.

Нічога ня робіць у падрыхтоўцы да сяўбы і райкаапсаюз: не мабілізаваны ўнутраныя рэсурсы жалеза на правядзеньне рамонту сельска-гаспадарчага інвэнтару, нічога ня зроблена па забесьпячэньні калгасаў збруяй, у якой адчуваецца вялікая патрэба амаль ва ўсіх гаспадарках.

Загатоўка сартовага насеньня праходзіць дрэнна. Замест 2.126 цэнтн. буду, загатоўлена толькі 120 цэнт. Ячменю трэба загатовіць 160 цэнтн., а загатоўлена толькі 31 цэнтн. Зусім не разгорнута работа па загатоўцы насеньня траў. Канюшыны трэба загатовіць 363 цэнтн., загатоўлена—82 цэнтн., вікі загатоўлена толькі восьмая частка пляну. Яшчэ горш стаіць справа з загатоўкай насеньня іншых відаў траў. Насеньне сілосных культур (кукурузы і сланечнік) да гэтага часу не завезена.

Ня ў лепшым становішчы знаходзіцца і загатоўка насеньня кораньплодаў і гародных культур: насеньня буракоў загатоўлена 50 проц. заданьня, другіх культур—зусім нязначны процант.

Да гэтага часу Райкаапсаюз не арганізаваў вучот правядзеньня ўнутрысялянскіх сортаабменных апэрацый.

Нездавальняюча стаіць справа і ў галіне завозу ўгнаеньня. У раён павінна быць завезена 719 тон штучнага ўгнаеньня, але пакуль што завезена 240 тон, а калгасы, фактычна, забралі толькі 92 тоны. Белсельснаб злачынна затрымлівае адгрузку ўгнаеньня. Ён абяцае выслаць сільвініт толькі да 15 сакавіка і то не ў пакрышаным выглядзе; на месцы прыдзецца сільвініт малоць на вапельнях, што, пры веснавым бездарожжы, затармазіць прасоўваньне ўгнаеньня да гаспадарак.

Ня гледзячы на абмежаванасьць адгрузкі ўгнаеньня калгасы не клапоцяцца аб тым, каб атрымаць яго своячасова. Некаторыя калгасы забіраюць угнаеньне, але значная частка з іх, купіўшы ўгнаеньне, не сьпяшаецца з вывазкай.

На Райкаапсаюзе ляжыць абавязак і тэхнічнага афармленьня дагавораў па кантрактацыі яравых пасеваў. Аднак, Райкаапсаюз нават не ведае, у якіх рёсках, раёнах прыняты пастановы аб кантрактацыі.

Усе паданыя вышэй факты яскраза сьведчаць аб безадказнасьці, аб тым, самацёку, які панае ў галіне падрыхтоўкі да сяўбы на Слуцкім раёне.

А—м. В—н.

ДОСЫЦЬ МАРУДЗІЦЬ

Менскі прыгарадны садовы саўгас імя Лекерта адстае ў падрыхтоўцы да веснавой сяўбы. Ня гледзячы на тое, што ў саўгасе не хапае насеньня гародных культур, да гэтага часу ня скончаны абмалот высадак буракоў, ня прымаюцца належныя захады для ваха ваньня насеньня.

Вельмі марудна праходзіць работа па закладцы парнікоў. Замест патрэбных 50 рабочых у дзень, бывае ня больш 5-10 рабочых. У выніку гэтага плян па закладцы парнікоў выкананы ўсяго на 25 проц.

Амаль нічога ня робіцца па рамонту с.-г. машын і вазоў. Між тым, значная частка вазоў патрабуе буйнага рамонту. Да гэтага часу адміністрацыя саўгасу не паклапацілася аб набыцьці патрэбнага для рамонту лесаматар'ялу.

Праўленьне МЦРК зусім не зварочвае ўвагі на тое, каб забясьпечыць рабочых спэцвопраткай. Некаторыя рабочыя не забясьпечаны абуткам, у выніку чаго бываюць прагулы.

Вока.

ВЫСОЎВАЕМ СУСТРЭЧНЫ ПЛЯН

Пухавіцкі сельсавет, Жыткавіцкага раёну, стаіць на першым месцы ў раёне па калектывізацыі. На 5-га лютага ў сельсавеце было калектывізавана 58 проц. усіх бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

На сходах у час перавыбараў сельсаветаў быў высунуты сустрэчны плян калектывізацыі; замест пляновых 50 проц. калектывізацыі сход высунуў 70 проц.

Зараз Пухавіцкі сельсавет стаіць на шляху выкананьня сустрэчнага пляну. 7-га лютага на хутарох Яма арганізаван новы калгас. 12-га лютага на хутары Храпялеўскі таксама арганізаваны калгас «Чырвоны Партызан».

Перавыбары праўленьняў калгасаў і выключэньне кулакоў, якія прымазаліся да калгасаў яшчэ больш узмацняюць прыліў у калгасы.

Калгасьнік.

Лоеўшчына ня выконвае сустрэчнага

Патрэбен рашучы пералом

Лоеўскі раён атрымаў заданьне заняць пад яравыя культуры 20797 га су проць 15256 га ў 1930 г. альбо павялічыць плошчу супроць мінулага году на 28 проц. З свайго боку раён высунуў свой сустрэчны плян у 21347 га.

Не гледзячы на прыняцьце сустрэчнага пляну, справа падрыхтоўкі да веснавой сяўбы ідзе вельмі дрэнна. Да гэтага часу ня складзены яшчэ прамфінплян арганізуемага сьвінагадоўчага саўгасу на плошчы ў 750 га, нічога таксама ня робіцца па лініі Белкаапсаюзу ў арганізацыі прыгарадных гаспадарак на тэрыторыі ў 300 га. Цьвёрдыя заданьні па сяўбе кулацка-заможным гаспадаркам не дадзены. На 70 проц. пляны яшчэ не даведзены да двара. Ня гледзячы на тое, што ўсё сельсаветы забясьпечаны зерняачышчальнымі абозамі, плян зерняачыстак сараваны: Насеньня зярнёвых культур ачышчана на 20 проц., тэхнічных—13 проц. Асабліва ўпартую бязьдзейнасьць праявіў Ручаеўскі сельсавет, які маючы 8 зерняачышчальных машын да гэтага часу ня вялікага цэнт. насеньня не ачысьціў. Стварэньне страхавых і насенных фондаў таксама праходзіць нездавальняюча; плян па лініі калгасаў выкананы толькі на 45 проц. і зусім нічога ня зроблена; ў аднаасобным сэктары: нічога ня зроблена па загатоўцы насеньня лубіну, канюшыны, і кораньплодаў. Між тым пад гэтыя культуры павінна быць занята 700-800 га. Яшчэ горш абстаіць справа з рамонтам с.-г. інвэнтара. З усяго гэтага відаць, што падрыхтоўка да веснавой сяўбы па Лоеўскім раёне знаходзіцца пад патрозай зрыву. Тлумачыцца гэта толькі тым што сельсаветы, партыйна-камсамольскія ячэйкі да гэтага часу праяўляюць у гэтай справе і поўную бязьдзейнасьць. Неабходна таксама адзначыць, што шэфы Лоеўскага раёну — Гомельскі завод «Пралетары»—у адносінах дапамогі веснавой сяўбы да гэтага часу, нічога не зрабіў, у той час, калі такая дапамога, гамонт с.-с. інвэнтара, павінна адыграць вялізарную ролю ў справе правядзеньня веснавой пасеўнай кампаніі.

Брыгадзір П. П. Трафімовіч.

Жыцьцё пераканала

Калгас «Новы Селянін», Дрысенскага сельсавету, Стара-Дароскага раёну, арганізаваўся ў пачатку 1930 году. Да пачатку веснавой сяўбы мінулага году ў калгасе засталося толькі 20 гаспадарак. Але ня гледзячы на гэта калгас са сваімі задачамі справіўся добра. Гадавы баланс і паасобны разьлік з кожным членам калгасу паказаў відавочна батраку, бедняку і серадняку, што калгас зьяўляецца адзіай а лепшых форм вядзеньня сельскай гаспадаркі, і толькі гэта форма можа забясьпечыць палепшаньне матарыяльнага становішча працоўных. Валавы прыбытак калгасу на 1-І 1931 г. складае 11.945 руб. 40 кап.; калгас аддаў пазыку, якую ён атрымаў, выплаціў падатак і страхоўку, і вярнуў дзяржаве насеньне, якое было ўзята ў весну 1930 г. Зараз поўнасьцю створаны насенныя і страхавыя фонды на 1931 г. і поўнасьцю падрыхтаваліся да сяўбы. Серадняк, аднаасобнік з сярэдняй маёмасьцю не атрымаў ад сваёй гаспадаркі столькі прыбытку, колькі мае калгасьнік, былы бядняк.

На агульным сходзе калгасьнікаў, дзе абгаворвалася пытаньне разьмеркаваньня прыбыткаў, на якім удзельнічалі і ўсе аднаасобнікі гэтай вёскі—прышлі да вываду, што толькі калектывізацыя можа палепшыць матар'яльнае становішча працоўнага сялянства. У выніку чаго на гэтым сходзе ў калгас «Новы Селянін» уступіла 20 гаспадарак і 5 адзіночак.

Мельнік Пятрок.

Пад сьцягам сацспаборніцтва

Валевачоўскі сельсавет, Сьмілавіцкага раёну, выклікаў на сацыялістычнае спаборніцтва суседні Карзуноўскі сельсавет на лепшае правядзеньне веснавой пасеўкампаніі. Ужо арганізаваны ініцыятыўныя групы ў в. Крывапольле, Вубем і Станево па вярбоўцы ў калгасы беднякоў і сераднякоў.

Насеннага матар'ялу па заданьні ў 183 цэнт. загатоўлена ўжо 157 цэнт. Прыступлена да збору попелу.

Ачыстка насеньня ідзе поўным ходам. Машыны працуюць бесьперабойна па вызначаным календарным пляне. Кулацка - заможная частцы, якая імкнулася сарваць працу па ачыстцы насеньня, дадзены рашучы адпор.

Старшыня с-с тав. Коляга абвясьціў сябе ўдарнікам у правядзеньні веснавой сяўбы.

Я.

Тураўскі р-н.

На заклік X усебеларускага зьезду саветаў—

ударна правесьці месячнік ліквідацыі прарываў фінпляну

Рашуча націснуць на кулака! Культзбор у вёсцы і горадзе сабраць цалкам і без адтэрміноўкі.

Па ўхабах работы мабілізацыі сродкаў

(АБ ЧЫМ ПІШУЦЬ НАШЫ РАБСЕЛЬКОРЫ).

Выкананьне фінансавага пляну трэцяга рашаючага году пяцігодкі ставіць перад нашымі мясцовымі фінансава-каапэрацыйнымі і савецкімі ўстановамі, грамадзкімі, партыйна-камсамольскімі і прафэсыянальнымі арганізацыямі вялізарнейшыя, патрабуючыя неадкладнай, энэргічнай работы, задачы.

Усямернае садзейнічаньне мясцовых арганізацый фінансава-каапэрацыйным установам у іх рабоце па мабілізацыі сродкаў павінна зьявіцца зьвязваючым ланцугом паміж работай устаноў і арганізацый, з аднаго боку, і з другога—гэта зьявіцца лепшым сродкам уцягненьня шырокіх колаў калгаснага, бядняцка-серадняцкага і іншага працоўнага насельніцтва непасрэдна ў работу па мабілізацыі сродкаў.

Ударная работа, якая зараз павінна быць уключана ў пляны работы кожнай раённай ўстановы і арганізацыі, работа рэалізацыі пазыкі на вёсцы, правядзеньне культзбору, уцягненьне ўкладчыкаў у ашчадкасы, спагнаньне недаімак і розных плацяжоў,—гэтая работа абавязвае ўсе ўстановы і арганізацыі, у першую чаргу райвыканкомы, сельсаветы і камсоды пры іх пераключыць сваю дзейнасьць на рэйкі ўдарніцтва і сацспаборніцтва, па мэтады масавай работы.

Аднак, на справе ў шмат якіх мясцох, як пішуць нам рабселькоры, гэта ня так.

„І я ня я—і хата не мая"...

Распачатая справаздачна - перавыбарчая кампанія камсоду павінна выявіць усе хібы работы камсоду, каб улічаныя памылкі паслужылі вурокам у далейшай рабоце камсоду. Прарывы ў выкананьні фінпляну раёну, сельсавету, установы ці прадпрыемства характарызуюць дрэнную работу камсоду пры іх. Лепшай ілюстрацыяй сказанага зьявіцца допіс селькора Дзяшковіча, які піша што райкамсод Асіповіцкага раёну садзейнічаньне дзяржкрэдыту і ашчадсправе ня лічыць за абавязак, а лічыць за абавязак «рэгуляваць спрэчныя пытаньні», г. зн. займацца выдачай дазволаў на продаж аблігацый пазыкі. Скліканае за ўвесь час адно пасяджаньне райкамсоду разглядала... заявы на продаж аблігацый пазыкі. А тое, што пры калгасах і сельсаветах яшчэ не арганізаваны камсоды, што ашчадсправа па раёне заглохла, гэтым камсод ня цікавіцца. Ня дзіва, што лютаўскае заданьне па мабілізацыі сродкаў на 20 лютага выканана ўсяго на 36 проц. Ажыцьцяўленьнем пастановы аб правядзеньні конкурсу-сацспаборніцтва на лепшы камсод ні Райком КП(б)Б ні РВК не займаюцца.

Работа ашчадкас зараз набывае вялікае значэньне. Але, на вялікі жаль, ня ўсюды работа ашчадкас пастаўлена на належную вышыню. Вінаваты тут і камсоды і райфінаддзелы.

Селькор Х. Г—н паведамляе, што ашчадкаса пры Лельчыцкай пошце знаходзіцца ў стадыі развалу. Памяшканьня каса ня мае, тайна ўкладаў з прычыны бязладнага становішча касы, не забясьпечваецца. Селькор Серада піша, што загадчык ашчадкасы в. Раўковічы, Чачэрскага раёну, Зайцаў ходзіць акуратна атрымліваць... сваю пэнсію, а на работу зьяўляецца, калі ўздумае. Каса цэлымі днямі бывае зачынена. Селькор «Сябра саюзу» піша, што некаторыя настаўнікі Касьцюковіцкага раёну «дэманстратыўна» адмаўляюцца быць укладчыкамі ашчадкас. Ня гледзячы на пастанову прафактыву Самацеевіцкага сельсавету, каб усе члены саюзу зьяўляліся ўкладчыкамі, настаўнік ШКМ—Кушнер і загадчык яўрэйскай нац. школы Шальман ад гэтага адмаўляюцца і вядуць агітацыю супроць уцягненьня ўкладчыкаў. Райпрафсавет на такія зьявішчы не рэагуе і ніякай растлумачальнай работы сярод членаў саюзу не вядзе.

Ударыць па носьбітах апартунізму і самацёку

Па лініі каапэрацыйнай і калгаснай сыстэмы работа па мабілізацыі сродкаў таксама праходзіць нездавальняюча. Дырэктыва кіруючых органаў каапэрацыйнай сыстэмы цэлым радам райспажыўтаварыстваў ня выконваецца. Брыгадзір «Савецкай Беларусі» т. Гайдук П. піша, што Дубровенскае райспажыўтаварыства да работы мабілізацыі сродкаў адносіцца скептычна і работу па ўцягненьні ўкладаў і зборы мэтавых узносаў на будаўніцтва, а таксама і хутчэйшую рэалізацыю тавараў у крамах, лічыць непатрэбнай. Пытаньнем каапэраваньня насельніцтва праўленьне РСТ не займаецца, работнікі вясковых крам сьвядома не праводзяць гэтай работы, бо «няма ўказаньняў зьверху». Селькор «Брыгадзір» піша, што райкалгассэкцыя і райкаапсаюз Сьвіслацкага раёну заданьне першага кварталу ў суме 32.000 руб. на 22 лютае выканалі толькі на... 893 руб. Старшыня райкалгассэкцыі, калі на якім-небудзь паседжаньні стаіць пытаньне мабілізацыі сродкаў, зусім выходзіць з яго. Гэтая «манера» у яго ўвайшла ў звычку. З прычыны такіх праваапартуністычных адносін да мабілізацыі сродкаў, гэтая работа па раёне носіць кампанейскі характар, а то і зусім не праводзіцца. Аднаразовы збор спагнаны ўсяго на 50 проц.

Праўленьне Глускага райспажыўтарыства паведаміла рэдакцыю, што за зрыў кампаніі мабілізацыі сродкаў праўленьне РСТ вынесла суровую вымову з занясеньнем на чорную дошку раду работнікаў вясковых крам.

Сьцяна апартунізму ў рабоце мабілізацыі сродкаў павінна быць разбурана. Трэба з усёй рашучасьцю ўдарыць па канкрэтных носьбітах права апартунізму і самацёку ў фінансава-каапэрацыйным апараце. Ажыцьцяўленьнем грамадзкага кантролю над работай ашчадкас і камсоду можна дабіцца посьпеху у выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў.

Р. Вэр.

Змагацца за поўнае выкананьне

і перавыкананьне пляну лёназагатовак

Мацней націснуць на кулака, які яшчэ ня выканаў цьвёрдых заданьняў

Плян выканалі на 79 проц.

Арганізуем чырвоны абоз

Путняеўскі сельсавет, Аршанскага раёну, гадавы плян загатовак лёну выканаў на 79 проц.

Пытаньне двухдэкадніка штурму лёназагатовак падрабязна абмеркавана на пленуме сельсавету.

Для правядзеньня двухдэкадніка штурму лёназагатовак была складзена з мясцовага актыву брыгада.

Пленум сельсавету даручыў усім членам сельсавету дабіцца поўнага выкананьня заданьня загатовак лёну і прыняў на сябе абавязак арганізаваць чырвоны абоз лёну і грубых кармоў.

Даронін П. І.

Зьнізілі тэмпы

Тав. Сталін казаў, што затрымаць тэмпы—гэта значыць адстаць. Аднак, Нідальскі сельсавет, Бягомльскага раёну, аб гэтым забыўся і тэмпы ў лёназагатоўках зусім зьнізіў. Спачатку адзначалася ўсё добра: былі даведзены нормы загатовак да кожнае вёскі, а таксама дадзены цьвёрдыя заданьні кулацка-заможным двароў; заставалася толькі мабілізаваць увесь актыў, усю масу калгасьнікаў і беднякоў з сераднякамі на барацьбу за 100 процантнае выкананьне гэтых нормаў. Але гэтага ня было зроблена. У выніку чаго на 20 лютага 16 кулацка-заможных гаспадарак ня выканалі цьвёрдага заданьня па лёназалаку.

Сельсавет ня прымае ніякіх мер да злосных нядзатчыкаў. Ня мае таксама сельсавет вучоту, колькі адзалзена лёну беднякам-серадняцкімі гаспадаркамі. У калгасах лён ляжыць ня мятым (калгас «Краіна Саветаў»). Партыйная і камсамольская ячэйкі нічым не дапамагаюць у правядзеньні лёназагатовак.

Трэба пакончыць з бязьдзейнасьцю ў лёназагатоўках па Нідальскім сельсавеце. Лён трэба здаць прамысловасьці своячасова.

Селькор Стральчонак.

Пералом створан

Замошанскі сельсавет, Халопеніцкага р-ну, гадавы плян лёназагатовак выканаў на 24 проц. Апартуністычная недаацэнка кампаніі загатовак лёну не давала магчымасьці як належыць разгарнуць загатоўкі. І толькі пасьля прыезду брыгады па правядзеньні двухдэкадніка штурму лёназагатовак у рабоце намеціўся вялікі зрух. Плян пачынае выконвацца шпаркім тэмпам. Кожны дзень сяляне вязуць лён у каапэрацыю. За адзін толькі дзень 16 лютага здадзена больш 15 пудоў лёнавалакна.

Брыгадзір Р.

Зьняць замкі!

Плян лёназагатовак па Копыскім раёне выканан на 60 проц. Аднак, ня ўсім кулацка-заможным гаспадаркам даны цьвёрдыя заданьні, а тыя, што атрымалі гэтыя заданьні, лёну не здаюць.

Загатоўчыя пункты часта бываюць замкнёны, калі прывозяць здаваць лён. Не хапае прамтавараў для прэміраваньня здатчыкаў лёну. РВК, Райкаапсаюз ніякіх захадаў ня прымаюць для рэгуляваньня гэтай справы.

А. Г.

КУЛАК ЯШЧЭ НЯ ЗДАЎ ЛЁНУ

Патрэбны рашучы націск

Гадавы плян загатовак лёнавалакна на 25 лютага выканан на 32,3 проц., пянькі—11,4 проц., лёнасемя—56,7 пр., канапель—57,7 проц.

Апошняя пяцідзёнка дала 1,5 проц. гадавога пляну лёнавалакна.

За час двухдэкадніка штурму лёназагатовак (5—25 лютага) лёнавалакна здана 5 проц. гадавога заданьня, пянькі 2,5 проц., лёнасемя—2,5 проц. і канапель—3,3 проц. Аднак, гэтыя лічбы не характарызуюць таго, як праведзен двухдэкаднік на мясцох, бо там ён пачаўся са значным спазьненьнем (больш чым на дэкаду) і яшчэ ня скончан і па сёньняшні дзень. Такім чынам, дакладных вынікаў правядзеньня двухдэкадніка штурму ня маецца.

Паводле няпоўных вестак, цьвёрдыя заданьні з кулацкіх гаспадарак спагнаны толькі на 60 проц., не зважаючы на тое, што тэрмін здачы кулакамі цьвёрдых заданьняў даўно прамінуў. Рад раёнаў, як Пухавіцкі, Камарынскі, Мазырскі, Прапойскі і іншыя раёны, зусім ня думаюць даваць вестак аб выкананьні кулацкімі гаспадаркамі заданьняў.

МАГІЛЕЎШЧЫНА ПА РАНЕЙШАМУ АДСТАЕ

(АД НАШАГА МАГІЛЕЎСКАГА КА РЭСПАНДЭНТА)

У большасьці сельсаветаў Магілеўскага раёну мясцовыя арганізацыі не зразумелі палітычна-гаспадарчай важнасьці двухдэкадніка штурму лёназагатовак, не зразумелі, што барацьба за лён—ёсьць барацьба за нармальную, бесьперабойную работу нашай сацыялістычнай тэкстыльнай прамысловасьці, за поўнае выкананьне пляну 3-га рашаючага году пяцігодкі.

Работнікі загатоўчых арганізацый замест пераключэньня на ўдарныя тэмпы штурму па ліквідацыі прарываў, усё яшчэ праяўляюць злачынную бязьдзейнасьць.

Амаль па ўсіх сельсаветах калгасныя і бядняцка-серадняцкія масы ня былі мабілізаваны на правядзеньне двухдэкадніка. Рашучага нажыму на кулацка-заможныя гаспадаркі па неадкладнай здачы імі цьвёрдых заданьняў няма. Не праведзена работы з калгасьнікамі, беднякамі і сераднякамі па выкананьні лёназагатовак у парадку самаабвязацельстваў.

У выніку ўсяго гэтага прарыў паглыбляецца. Тэмпы лёназагатовак значна панізіліся: За апошнюю пяцідзёнку мы маем павялічэньне загатовак толькі на 1 проц. Гадавы плян на сёньняшні дзень выканан на 28 проц.

Абураюча злачынным зьяўляецца той факт, што ніводная з раённых арганізацый ня ведае становішча выкананьня цьвёрдых заданьняў кулацка-заможнымі гаспадаркамі.

Раённыя арганізацыі недастаткова займаюцца кантраляваньнем мясцовых і ў першую чаргу загатоўчых арганізацый па выкананьні дырэктыў партыі і ўраду ў лёназагатоўках. Недастаткова вядзецца барацьба з правямі апартунізму.

Злачыннай бязьдзейнасьці, няўменьню па бальшавіцку працаваць і мабілізаваць масы павінен быць паложан канец.

Тэрміны выкананьня цьвёрдых заданьняў кулацка-заможнымі гаспадаркамі прайшлі. Без усякага адкладу трэба прыцягнуць кулака да адказнасьці за невыкананьне цьвёрдых заданьняў.

Магілеўшчына павінна здаць лён адзіным чырвоным скразным раённым абозам. Абавязацельствы дэлегатаў зьезду ў рапарце мільёнаў X зьезду саветаў павінны быць выкананы.

Ал. Нёманскі.

685 коп неапрацаванага лёну

знаходзіцца ў калгасах

Двухдэкаднік штурму лёназагатовак не ліквідаваў прарываў у Хойніцкім раёне. Сельсаветамі яшчэ і да гэтага часу ня дадзены цьвёрдыя заданьні ўсім кулакам.

Калгасы не здалі лёну, бо яшчэ не апрацавалі яго. У колгасе «Сталіна» ляжыць 500 коп неапрацаванага лёну, у калгасе «Камінтэрн»—50 коп, «Самалец»—15 коп, «Кастрычнік»—60 коп, «Каапэратар»—20, «Чырвоная Перамога»—40 коп.

Гэты факт сьведчыць аб недбайных адносінах да лёназагатовак з боку праўленьняў калгасаў. Лён ёсьць, яго трэба толькі апрацаваць.

Янка Круцін.

Двухдэкаднікам штурму ніхто не займаўся

Случчына да гэтага часу вельмі марудна пасоўваецца наперад з выкананьнем пляну загатовак лёнавалакна.

На 20-га лютага гадавое заданьне выканана на 33 проц.

Цьвёрдыя заданьні да кулацкага двара даведзены, але кулакі ня выконваюць іх. Райвыканком ніякіх захадаў ня прымае, чым патурае кулацтву, якое ня толькі ўхіляецца ад выкананьня, але шляхам агітацыі імкнецца зрабіць свой ўплыў на серадняцкую і нават бядняцкую частку сялянства.

Двухдэкаднікам штурму ніхто не займаўся. Значэньне двухдэкадніка не папулярызавана сярод насельніцтва

Такія апартуністычныя адносіны да лёназагатовак павінны быць зьнішчаны. Плян лёназагатовак павінен быць выканан.

А. Курдо.

На заклік X усебеларускага зьезду саветаў—

ударна правесьці месячнік ліквідацыі прарываў фінпляну

Рашуча націснуць на кулака! Культзбор у вёсцы і горадзе сабраць цалкам і без адтэрміноўкі.

Па ўхабах работы мабілізацыі сродкаў

(АБ ЧЫМ ПІШУЦЬ НАШЫ РАБСЕЛЬКОРЫ).

Выкананьне фінансавага пляну трэцяга рашаючага году пяцігодкі ставіць перад нашымі мясцовымі фінансава-каапэрацыйнымі і савецкімі ўстановамі, грамадзкімі, партыйна-камсамольскімі і прафэсыянальнымі арганізацыямі вялізарнейшыя, патрабуючыя неадкладнай, энэргічнай работы, задачы.

Усямернае садзейнічаньне мясцовых арганізацый фінансава-каапэрацыйным установам у іх рабоце па мабілізацыі сродкаў павінна зьявіцца зьвязваючым ланцугом паміж работай устаноў і арганізацый, з аднаго боку, і з другога—гэта зьявіцца лепшым сродкам уцягненьня шырокіх колаў калгаснага, бядняцка-серадняцкага і іншага працоўнага насельніцтва непасрэдна ў работу па мабілізацыі сродкаў.

Ударная работа, якая зараз павінна быць уключана ў пляны работы кожнай раённай ўстановы і арганізацыі, работа рэалізацыі пазыкі на вёсцы, правядзеньне культзбору, уцягненьне ўкладчыкаў у ашчадкасы, спагнаньне недаімак і розных плацяжоў,—гэтая работа абавязвае ўсе ўстановы і арганізацыі, у першую чаргу райвыканкомы, сельсаветы і камсоды пры іх пераключыць сваю дзейнасьць на рэйкі ўдарніцтва і сацспаборніцтва, па мэтады масавай работы.

Аднак, на справе ў шмат якіх мясцох, як пішуць нам рабселькоры, гэта ня так.

„І я ня я—і хата не мая"...

Распачатая справаздачна - перавыбарчая кампанія камсоду павінна выявіць усе хібы работы камсоду, каб улічаныя памылкі паслужылі вурокам у далейшай рабоце камсоду. Прарывы ў выкананьні фінпляну раёну, сельсавету, установы ці прадпрыемства характарызуюць дрэнную работу камсоду пры іх. Лепшай ілюстрацыяй сказанага зьявіцца допіс селькора Дзяшковіча, які піша што райкамсод Асіповіцкага раёну садзейнічаньне дзяржкрэдыту і ашчадсправе ня лічыць за абавязак, а лічыць за абавязак «рэгуляваць спрэчныя пытаньні», г. зн. займацца выдачай дазволаў на продаж аблігацый пазыкі. Скліканае за ўвесь час адно пасяджаньне райкамсоду разглядала... заявы на продаж аблігацый пазыкі. А тое, што пры калгасах і сельсаветах яшчэ не арганізаваны камсоды, што ашчадсправа па раёне заглохла, гэтым камсод ня цікавіцца. Ня дзіва, што лютаўскае заданьне па мабілізацыі сродкаў на 20 лютага выканана ўсяго на 36 проц. Ажыцьцяўленьнем пастановы аб правядзеньні конкурсу-сацспаборніцтва на лепшы камсод ні Райком КП(б)Б ні РВК не займаюц

ЗАКОНЫ І ПАСТАНОВЫ УРАДУ БССР

Пастанова

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

ПРА ЗЬМЕНЫ ЗАКОНАДАЎСТВА БССР У СУВЯЗІ З ПАСТАНОВАЮ ЦВК І СНК СССР «ПРА ПАДАТАК З БУДЫНКАЎ І ЗЯМЕЛЬНУЮ РЭНТУ».

У адпаведнасьці з пастановаю ЦВК і СНК СССР за 23 лістапада 1930 г. «Пра падатак з будынкаў і зямельную рэнту» (З. З. СССР 1930 г., № 58, арт. 612) ЦВК і СНК БССР пастанаўляюць зрабіць наступныя зьмены ў заканадаўстве БССР:

1. Дапоўніць арт. 20 Палажэньня пра мясцовыя фінансы БССР (З. З. БССР 1928 г., № 33, арт. 313) п. «у» у наступнай рэдакцыі:

у) будынкі, якія належаць да маемасьці мясцовых саветаў».

2. Запісаць арт. 21 Палажэньня пра мясцовыя фінансы БССР і ўвагі да яго (З. З. БССР 1928 г., № 33, арт. 313, № 38, арт. 368) у наступнай рэдакцыі:

«21. Падатак з будынкаў бярэцца ў разьмерах:

а) з будынкаў дзяржаўных прамысловых прадпрыемстваў ня больш 0,75 проц. балянсавага кошту (бяз скідкі на амартызацыю);

б) з іншых будынкаў апрамаджанага сэктару ня больш 1 проц. балянсавага кошту (бяз скідкі на амартызацыю);

в) з будынкаў рабочых і служачых ня больш 1 проц. кошту па страхавой ацэнцы;

г) з іншых будынкаў ня больш 1,5 проц. кошту па страхавой ацэнцы.

Савет Народных Камісараў БССР мае права павялічыць гранічны разьмер стаўкі падатку з будынкаў, прадугледжаны ў п. «г» для пасобных катэгорый платнікаў да 2 проц. іх кошту.

Калі немагчыма ўстанавіць балянсавы кошт альбо калі няма страхавой ацэнкі, дык падатак бярэцца з кошту, які вызначаецца падатковымі органамі.

Падатак з будынкаў апрамаджанага сэктару вылічваецца ўстановамі, прадпрыемствамі і арганізацыямі, якія зьяўляюць платнікамі падатку, а з будынкаў прыватных асоб—падатковымі органамі».

3. Скасаваць пастанову СНК БССР за 24 сьнежня 1928 г. «Пра гранічны разьмер мясцовага падатку з будынкаў» (З. З. БССР 1928 г., № 37, арт. 358 і 1929 г., № 41, паст. 246).

4. Запісаць арт. 1 раскладу гранічных ставак мясцовых падаткаў і зборaў (дадатак № 1 да Палажэньня пра мясцовыя фінансы БССР—З. З. БССР. 1928 г., № 33, арт. 313) у наступнай рэдакцыі.

НАЗВА МЯСЦОВЫХ ПАДАТКАЎ І ЗБОРАЎ.	Вышэйшыя гранічныя стаўкі				
	Для гарадоў			Для мястечак	Для сельскіх мясцовасьцяй
	Менску, Гомелю і Віцебску	Магілева Бабруйска, Воршы	Іншых гарадоў		
Падатак з будынкаў (арт. арт. 19-23 Палажэньня):					
а) з будынкаў дзяржаўных прамысловых прадпрыемстваў ня больш . . .	0,75 проц. балянсавага кошту.				
б) з іншых будынкаў апрамаджанага сэктару ня больш	1 проц. балянсавага кошту.				
в) з будынкаў рабочых і служачых ня больш . .	1 проц. кошту па страхавой ацэнцы,				
г) з іншых будынкаў ня больш	1,5 проц. кошту па страхавой ацэнцы.				

5. Дапоўніць Палажэньне пра мясцовыя фінансы БССР (З. З. БССР 1928 г., № 33, арт. 313) арт. 21¹ у наступнай рэдакцыі:

21¹. 25 проц.—ад паступленьня падаткаў з будынкаў выдаткоўваюцца на патрэбы камунальнага, жыльлёвага і сацыяльна-культурнага будаўніцтва».

6. Запісаць п. «в» арт. 17 Палажэньня пра мясцовыя фінансы БССР (З. З. БССР, 1928 г., № 33, арт. 313) у наступнай рэдакцыі:

«в) ад зямельнай рэнты на падставе даданых правіл (дадатак № 3)».

7. Замест «Правіл спагнаньня рэнты з гарадзкіх земляў (дадатак № 4 да Палажэньня пра мясцовыя фінансы БССР—З.З. БССР 1928 г., № 33, арт. 313) запісаць «Правіты спагнаньня зямельнай рэнты ў БССР» у наступнай рэдакцыі:

«Дадатак № 4».

Да п. «в» арт. 17.

Правілы спагнаньня зямельнай рэнты ў БССР:

1. Рэнта бярэцца з забудаваных і незабудаваных земляў, што знаходзяцца ў карыстаньні ўстаноў, прадпрыемстваў, арганізацый і асоб, калі за карыстаньне гэтымі землямі і пабудаванымі на іх будынкамі не бярэцца арэндная плата ў даход мясцовых саветаў.

З наступных земляў арэндная плата не бярэцца і можа браць рэнта:

а) з земляў, што абслугоўваюць будынкі, якія належаць каапэрацыйным арганізацыям, прыватным фізычным і юрыдычным асобам на праве ўласнасьці, і з земляў, адданых ім паводле дагавораў аб праве забудоўкі;

б) з земляў, адданых дзяржаўным прадпрыемствам паводле іх статутаў і палажэньняў альбо паводле дагавораў аб праве забудоўкі;

в) з земляў, што абслугоўваюць будынкі дзяржавы, апроч будынкаў, залічаных у маемасьць мясцовых саветаў;

г) з земляў, адданых у бястэрміновае карыстаньне жыльлёва-будаўнічым каапэрацыйным таварыствам (рабочым і агульна-грамадзянскім).

2) Рэнта вылічаецца па колькасьці квадратных мэтраў плошчы зямлі.

Рэнта не бярэцца з земляў:

а) пад могілкамі;

б) пад лятэрамі, стрэльбішчамі, палігонамі, аэрадромамі і пасадачнымі пляцоўкамі, што знаходзяцца пад ведамам альбо ў карыстаньні Народнага Камісарыяту Ваенных і Марскіх Спраў;

в) пад цытадэльнымі пабудовамі і ваеннымі партамі;

г) адданых транспарту, паводле палажэньня аб землях, адданых транспарту за 28 жніўня 1925 г. (З. З. БССР 1925 г., № 65, арт. 478);

д) сельскагаспадарчага карыстаньня, даход ад якіх павінен абкладацца адзіным сельскагаспадарчым падаткам, а таксама забудаваных пляцоў, беспасрэдна зьвязаных з сельскагаспадарчым карыстаньнем;

е) пад будынкамі (з належнымі да іх дваровымі месцамі), занятымі дзяржаўнымі ўстановамі і прадпрыемствамі, якія знаходзяцца на агульна-дзяржаўным бюджэце, а таксама прыроўненымі да іх ва ўстаноўленым парадку ў дачыненьні да спагнаньня рэнты, калі гэтыя будынкі і землі не скарыстоўваюцца праз здачу ў наймы;

ж) пад электрапередачамі і разьмеркавальнымі сеткамі дзяржаўных электрычных станцый, а таксама пад тэлефоннымі і тэлеграфнымі слупамі і іншымі тэхнічнымі пабудовамі Народнага Камісарыяту пошт і тэлеграфаў;

з) пад будынкамі (з належнымі да іх дварамі і садамі), занятымі вучонымі, навучальнымі і лекавымі ўстановамі, дамамі адпачынку, дзіцячымі дамамі і калёнямі і інвалідным ўстановамі дзяржаўных органаў, каапэрацыйных грамадзкіх арганізацый;

і) пад палацамі працы і пад будынкамі, занятымі прафэсійнымі арганізацыямі, рабочымі клюбамі і дамамі селяніна;

к) пад дзіцячымі пляцоўкамі і спартыўнымі стадыёнамі фізычнай культуры;

л) пад будынкамі, занятымі чужаземнымі дыпляматычнымі прадстаўніцтвамі, пры ўмове узаемнасьці;

м) земляў, якія знаходзяцца ў карыстаньні вайскоўцаў кадравага радавога і малодшага начальніцкага складу тэрміновай (бесперапынный альбо звыштэрміновай службы і вайскоўцаў сярэдняга, старшага і вышэйшага кадравага начальніцкага складу, а таксама сем'яў гэтых асоб,—пры ўмове, калі жылыя будынкі, якія знаходзяцца на гэтых пляцох не здаюцца ў наймы цалкам, і калі зямля сельскагаспадарчага карыстаньня апрацоўваецца бяз ужываньня наймовай працы і не абкладаецца адзіным сельскагаспадарчым падаткам.

Гэтая льгота захоўваецца да канца таго акладнога году, у якім паказаныя вайскоўцы былі зведены ў доўгатэрміновы водпуск, у запас ці зусім ад службы;

н) пад дзяржаўнымі прамысловымі прадпрыемствамі, прыведзенымі ва ўстаноўленым парадку ў стан кансэрвацыі, калі занятая імі зямля, альбо па будаваньня на іх будынкі не скарыстоўваюцца для якіх-небудзь працоўных прадпрыемству патрэб;

о) пляцоў, адданых паводле дагавораў забудоўкі для пабудаваньня жылых будынкаў, ад дня здачы пляцу да выхаду 3-х гадоў ад дня пабудаваньня будынкаў;

п) замацаваных за дзяржаўнымі ўстановамі і прадпрыемствамі пляцоў, што скарыстоўваюцца паказанымі ўстановамі і прадпрыемствамі для пабудаваньня жылых будынкаў, ад дня пачатку будаўнічых работ да выхаду 3-х гадоў ад дня пабудаваньня будынкаў;

р) пляцоў, адведзеных жыльлёва-будаўнічым каапэрацыйным таварыствам (рабочым і агульнаграмадзянскім) у бястэрміновае карыстаньне для пабудаваньня жылых будынкаў, ад дня адводу пляцоў да выхаду 3-х гадоў ад дня пабудаваньня будынкаў;

с) пляцоў, якія знаходзяцца ў карыстаньні ўтрыманцаў органаў сацыяльнага забясьпечаньня і сацыяльнага страхаваньня, пры ўмове, калі пры апрацоўцы зямлі яны ня ўжываюць наймовай сілы і не здаюць у наймы кватэр у памяшканьнях, што знаходзяцца на гэтых пляцох.

4. Пасьля выхаду 3-х гадоў ад дня пабудаваньня будынкаў рэнта бярэцца ў палавінным разьмеры з пляцоў, памянёных у п. «о», на працягу ўсяго тэрміну, што астацца па дагавору забудоўкі, а з пляцоў памянёных у п. п. «п» і «р» на працягу наступных 30 гадоў.

5. Льготы, устаноўленыя ў п. п. «о», «п» і «р» арт. 3, даюцца пры ўмовах, калі жылая плошча пабудаваных будынкаў складае ня менш 75 проц. агульнае плошчы гэтых будынкаў. Пры вызначэньні разьмераў жылой плошчы для атрыманьня паказаных льготы ў гэтую плошчу ўключаюцца кухні, пярэднія, калідоры, ванныя, прыбіральні і да т. п. памяшканьні агульнага карыстаньня. Гэтыя самыя льготы пашыраюцца і на пляцы, на якіх дабудоўваюцца, надбудоўваюцца, перабудоўваюцца і адбудоўваюцца будынкі для скарыстаньня іх для жыльля, калі кошт дабудоўкі, надбудоўкі і перабудоўкі альбо адбудоўкі складае ня менш 50 проц. ранейшай жылой плошчы;

6. Для ўстанаўленьня ставак рэнты ўсе паселішчы разьмяркоўваюцца на клясы ў залежнасьці ад іх адміністрацыйнага значэньня, колькасьці, сацыяльнага складу і асноўных заняткаў насельніцтва, развіцьця гандлю і прамысловасьці, становішча шляхоў і іншых эканамічных умоў, якія маюць ўплыў на рэнтабельнасьць зямель. Паселішчы на клясы разьмяркоўвае Народны Камісарыят Фінансаў БССР па ўзгадненьні з Вышэйшым Саветам Народнае Гаспадаркі БССР і Народным Камісарыятам Гандлю БССР.

7. Вышэйшыя гранічныя стаўкі рэнты за квадратны мэтр (у капейках устанаўляюцца па клясах паселішчаў і катэгорыях зямель у наступных разьмерах:

Клясы паселішчаў	ЗЕМЛІ ЗАНЯТЫЯ				
	Дзяржаўнымі прамысловымі прадпрыемствамі, забудаванымі і незабудаванымі	Гандлёвымі і канторскімі памяшкан. і складамі ў іх тавар. апрочаткрытых (не ў памяшк.) складаў агульн. карыстан.	Іншымі будынкамі, а таксама адкрытымі (не ў памяшканьнях) складамі матэрыял. апаху і тавар. прамыслов. прадпрыемств. (апроч. дзяржаўных)	Дварамі, а таксама адкрытымі (не ў памяшканьнях) складамі матэрыял. апаху і тавар. прамыслов. прадпрыемств. (апроч. дзяржаўных)	Гарокамі, садамі і палявымі культурамі
I	0,5	6	2	0,5	0,3
II	1	12	4	1	0,5
III	2	24	7	2	0,75
IV	3	36	10	3	1
V	4	60	15	4	1,25
VI	5	80	20	5	1,5
VII	6	100	25	7	2
VIII	7	120	30	8	2
IX	8	200	45	10	2,5

8. Стаўкі рэнты для кожнага паселішча ўстанаўліваюцца адпаведным мясцовым саветам асобна для гарадзкіх і пазагарадзкіх паселішчаў з дыфэрэнцыяцыяю, калі трэба, па частках паселішча ў межах, прадугледжаных арт. 7, і з захаваньнем арт. арт. 9—11 гэтых правіл.

Па стаўках, устаноўленых для земляў, занятых будынкамі, абкладаецца толькі плошча, занятая самімі будынкамі, рэшта-ж дваровага месца абкладаецца па стаўках для двароў.

9. Для дзяржаўных устаноў, дзяржаўных гандлёвых прадпрыемстваў і каапэрацыйных арганізацый, а таксама для рабочых і служачых стаўкі рэнты зьмяншаюцца ня менш як на 25 проц. у параўнаньні са стаўкамі, устаноўленымі адпаведным мясцовым саветам для аналёгічных земляў, занятых іншымі землякарыстальнікамі.

10. Для земляў, занятых гарадамі і садамі садова-гародніх таварыстваў, арцеляй, калектываў і іншых каапэрацыйных арганізацый, стаўкі рэнты зьмяншаюцца ня менш як на 50 проц. у параўнаньні з стаўкамі ўстаноўленымі мясцовым саветам для аналёгічных земляў, якія знаходзяцца ў прыватным індывідуальным карыстаньні.

11. Для земляў, занятых гарадамі і садамі прыватных асоб, якія рэалізуюць прадукцыю, вырашчаную на гэтых землях, поўнасьцю паводле дагавору праз каапэрацыю альбо дзяржаўныя органы, стаўкі рэнты зьмяншаюцца ня менш як на 15 проц. у параўнаньні з стаўкамі, устаноўленымі мясцовым саветам для аналёгічных земляў, якія знаходзяцца ў карыстаньні іншых прыватных асоб.

12. Землі, на якіх разводзяцца новыя пладовыя сады з захаваньнем норм і правіл Народнага Камісарыяту Земляробства, абкладаюцца рэнтаю ў першыя пяць гадоў, пачынаючы з дня пасадкі дрэў, у палавінным разьмеры.

13. Стаўкі стаўкі рэнты, якія ўстанаўляюцца мясцовымі саветамі для земель, занятых садамі і гарадамі, што знаходзяцца на акраінах гарадоў і мястэчак (у рэдка заселеных раёнах), павінны складаць для: а) залічаных у I, II і III клясы ня больш ⅔ гранічнай стаўкі, устаноўленай гэтымі правіламі; б) залічаных у IV, V і VI клясы ня больш ½ гранічнай стаўкі і в) залічаных у VII, VIII і IX клясы больш ⅓ гранічнай стаўкі.

14. Стаўкі рэнты для паверкі плянаў адданых у карыстаньні дзяржаўным горным і горна-завадзкім прадпрыемствам для эксплёатацыі непраў, устанаўляюцца з такім разьлікам, каб яны не перавышалі 25 проц. вышэйшых гранічных ставак, устаноўленых для дзяржаўных прамысловых прадпрыемстваў.

15. Землі, занятыя складамі, нафтапрадуктаў, лясных і іншых небясьпечных ад пажару матарыялаў, якія належаць дзяржаўным ці каапэрацыйным прадпрыемствам, абкладаюцца па стаўках, устаноўленых для дзяржаўных прамысловых прадпрыемстваў.

16. Рэнта бярэцца з уласьніка будынкаў, забудоўшчыка, альбо з тае ўстановы, прадпрыемства, арганізацыі ці асобы, якой ва ўстаноўленым парадку дадзена зямля, альбо пабудованы на ім будынак.

17. Рэнта з земляў аграмаджанага сэктару вылічаецца ўстановамі, прадпрыемствамі і арганізацыямі, якія зьяўляюцца платнікамі рэнты, а з земляў, адданых прыватным асобам,—падатковым органам.

18. 25 проц. паступленьняў рэнты ідуць на патрэбы камунальнага жыльлёвага і культурна-сацыяльнага будаўніцтва.

8. Скасаваць:

а) пастанову ЦВК і СНК БССР за 7 ліпеня 1928 г. «Пра льготы па рэнтавым абкладаньні для вайскоўцаў, дэмабілізаваных, утрыманцаў органаў сацыяльнага забясьпечаньня, беспрацоўных рабочых і служачых і сем'яў асоб пералічаных катэгорый» (З. З. БССР 1928 г., № 20, арт. 200; 1930 г., № 31, арт. 198);

б) пастанову Эканамічнай Нарады пры СНК БССР за 28 лютага 1930 г. «Пра разьмеркаваньне гарадоў, мястэчак, рабочых і дачных пасёлкаў БССР на клясы для эксплёатацыі непраў, устанаўляюцца з такім разьлікам, каб яны не перавышалі 25 проц. вышэйшых гранічных ставак, устаноўленых для дзяржаўных прамысловых прадпрыемстваў» (З. З. БССР 1930 г., № 12, арт. 93).

9. Увесьці гэтую пастанову ў сілу з 1 кастрычніка 1930 г.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.
Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР К. Бэнэк.
Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

15 лютага, 1931 г.
г. Менск.

Да распаўсюджваньня 3-й АЗЭТ-лётарэі ў БССР

Дзякуючы правільнай Ленінскай нацпалітыцы камуністычнай партыі і савецкай ўлады мы маем вялізарныя посьпехі ў галіне ўцягненьня яўрэйскай працоўнай беднаты ў сельскую гаспадарку і прамысловасьць,—посьпехі ў ліквідацыі спадчыны царызму і яго «нацыянальнай палітыкі».

За апошнія гады мы дасягнулі посьпехаў па ўцягненьні працоўнай яўрэйскай моладзі ў буйную прамысловасьць РСФСР (Урал, Н. Ноўгарад, Масква, Ленінград) і БССР. Акрамя гэтага, мы праводзім сацыялістычную будоўлю Біра-Біджана—раёну яўрэйскага землеўпарадкаваньня на Далёкім Усходзе,—мы маем вялізарнейшыя посьпехі па калектывізацыі яўрэйскіх пасёлкаў і вёсак у Крыму.

Гэтую працу праводзяць дзяржаўныя органы, як Камзэт пры ЦВК.

Усесаюзная арганізацыя АЗЭТ мае сваім прызначэньнем дапамагчы грамадзкімі сіламі і сродкамі справе ўцягненьня працоўных мас яўрэйскай беднаты ў вытворчую работу, прамысловасьць і сельскую гаспадарку.

Таварыства АЗЭТ Савецкага Саюзу зьяўляецца зараз арганізацыяй, якая аб'ядноўвае ў сваіх радох сотні тысяч працоўных розных нацыянальнасьцяй. Дапамагаючы дзяржаўным органам, АЗЭТ у той-жа час зьяўляецца базай для інтэрнацыянальнага выхаваньня шырокіх працоўных мас, арганізацыяй, якая праводзіць рашучую барацьбу з антысэмітызмам, вялікадзяржаўным шавінізмам і шавінізмамі ўсіх колераў.

За апошнія гады, дзякуючы правільнай лініі партыі на індустрыялізацыю краіны і калектывізацыю сельскай гаспадаркі, становішча яўрэйскай працоўнай беднаты гарадоў і мястэчак БССР значна палепшылася. Аднак, мы маем на сёньняшні дзень некаторую частку яўрэйскай дэклясаванай беднаты, якая да гэтага часу яшчэ ня ўцягнута ў сацыялістычную будоўлю. Гэтыя рэшткі былой палітыкі царызму мы пасьпяхова ліквідуем і павінны цалкам ліквідаваць у бліжэйшыя гады.

Задачай АЗЭТ у сучасны момант зьяўляецца дапамагчы партыі і дзяржаве ўцягнуць яўрэйскую беднату ў вытворчую работу, уцягнуць гэтую беднату ў сацыялістычную будоўлю.

Для ўзмацненьня фінансавай базы, для правядзеньня ўсіх мерапрыемстваў, АЗЭТ выпусьціў трэцюю Усесаюзную АЗЭТ-лётарэю. Рэалізацыя 6 мільёнаў білетаў АЗЭТ-лётарэі нам дасьць 3 мільёны рублёў на землеўпарадкаваньне (Крым, Біра-Біджан) і ўцягненьне ў прамысловасьць новых тысяч сем'яў яўрэйскай беднаты.

У той час, калі становішча працоўных яўрэйскіх мас у панскай фашысцкай Польшчы пагаршаецца з кожным днём, калі там буйнае антысэмітызм, зачыняюцца яўрэйскія школы і г. д., становішча яўрэйскіх мас у СССР паляпшаецца з дню на дзень. Яны ўцягваюцца ў актыўнае будаўніцтва сацыялістычнай грамады. І ня толькі ў Польшчы, тое самае мы маем у буржуазнай Румыніі, і ў Палестыне, дзе адбываюцца арабска-яўрэйскія пагромы.

Шляхам правядзеньня ў БССР АЗЭТ-лётарэі павінна быць распаўсюджана 600.000 білетаў на суму 300.000 рублёў. Гэта ёсьць ударная кампанія, якая павінна быць выканана цалкам пры ўдзеле ўсёй савецкай грамадзкасьці.

Усе савецкія, прафэсыянальныя, каапэрацыйныя арганізацыі і навучальныя ўстановы павінны ўключыць спрану рэалізацыі білетаў трэцяй АЗЭТ-лётарэі ў пляны сваёй работы.

Распаўсюджваючы трэцюю АЗЭТ-лётарэю трэба памятаць аб тым, што гэтым самым мы ўзмацняем будаўніцтва сацыялізму, узмацняем інтэрнацыянальную салідарнасьць усіх працоўных для канчатковай перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Ніводная працоўная Савецкай Беларусі бяз білета трэцяй АЗЭТ-лётарэі.

Старшыня Усебеларускага Лётарэйнага Камітэту АЗЭТ А. Хацкевіч.

З лістоў рабселькораў

Кантрактацыя ярыны па Сьмілавіцкім раёне не пачалася. Не разгорнута растлумачальная работа сярод калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас вёскі па гэтым пытаньні. Партыйныя і камсамольскія ячэйкі не даюць ніякай дапамогі сельсаветам у пасьпяховым правядзеньні ў жыцьцё адозвы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб кантрактацыі яравых пасеваў.

Высоцкі.

Аднаасобнікі Пугляеўскага сельсавету, Аршанскага раёну, якія займаюць каля 70 проц. усёй пахаці, не рыхтуюцца да веснавой сяўбы. Члены сельсавету ў гэтым напрамку нічога ня робяць.

А. К.

Ачыстка насеньня ў Станькаўскім сельсавеце, Койданаўскага раёну праходзіць самацёкам, бяз вялікага агляду і плянавасьці. Пляну сяўбы не даведзены да двара, кулацкім гаспадаркам не дадзена цьвёрдага заданьня.

В. Пых.

У калгасе «Камінтэрн», Хойніцкага раёну, да сяўбы ня рыхтуецца. Пляны сяўбы ня складзены, насеньне не ачышчана.

А. Гаруш.

Высачанскі раён дзейна рыхтуецца да веснавой сяўбы. Рад адказных работнікаў пасланы для практычнай дапамогі па сельсаветах. Пляны сяўбы даведзены да кожнага двара. Ачышчаецца насеньне, шырока папулярызуюцца адозва ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб кантрактацыі.

Аднак, Райкаапсаюз не забясьпечыў пасеўнай плошчы адведзенай колькасьцю насеньня лёну і вікі. У калгасах ня скончана сварэньне насенных і кармавых фондаў, насеньне хаваецца ў дрэнных умовах і можа папсавацца; не атрыманы сельскагаспадарчыя машыны і ўгнаеньні, якія марнуюцца на складах; не рамонтуецца сельскагаспадарчы інвэнтар, бо няма жалеза і вугля. Беларэмгандаль затрымлівае водпуск іх.

Сямён Вольны.

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

А. В.«Згніло з 2 га лістоў ад бураракоў», С. Члену—«Суд», Ляўцкаму—«Сьмілавіцкае Райбюро вазўнічых бязбожнікаў бязьдзейнічае», Я.—«Мабілізацыя ўродкаў», Ул В.—«Праверыць рады Асоавіяхіму», Пугачову—«Мы за генэральную», А. Х.-н «Магутная хваля калектывізацыі», І. Барноўскаму—«Весёлая вёска», Берыну—«Пачалася перавыбары сельсаветаў», матар'ял застарэў; да друку ня пойдзе.

Т. Кветку—«Чырвоны сьцяг», Ястрабу—«Мы выканаем толькі на паперы», Наблюдаючаму—«Как идет подготовка к перевыборам сельсоветов». Я.—«Аб перавыбарах савету», Мятлеу—«Спадзяваюцца на саманёк», П. Гру—«Беднякі і сераднякі даюць адпор падкулачнікам», Берыну—«Пачалася перавыбары сельсаветаў», матар'ял застарэў; да друку ня пойдзе.

Усебеларускі зьезд „Прыхільнікаў дзяцей" адкладзен

Пастановай Цэнтральнага Арганізацыйнага Камітэту скліканьне Усебеларускага зьезду т-ва «Прыхільнік Дзяцей» адкладзена да другой паловы красавіка месяца 1931 году.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

Група таварышоў—супрацоўнікаў рэдакцыі газ. „Савецкая Беларусь" выказваюць сваё глыбокае спачуваньне тав. ГУСТЫРУ Я. Т. з прычыны сьмерці яго бацькі Тодара Якубавіча Густыра

ТЭАТР-КІНО

Беларускі Другі дзярж. тэатр — 2, 3 і 4 САКАВІКА АДЧЫНЕНЫ СПЭКТАКЛЬ „РЭЙКІ ГУДУЦЬ" п'еса ў 5 дзеях, 9 абразох. Пачатак а 8 гадзіне

З ПАНЯДЗЕЛКА 2-га САКАВІКА

„Чырвоная Зорка" — Амэрыканскі фільм У СЬЛЕД. Штодзённа 4 сэансы. Пачатак а 6 гадзіне.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" — Камэдыя у 7 част. ДЗЯЎЧЫНА З СКРЫНКАЙ. Зьыш праграмы МАРОЗАМ. Дзеці да 16 год не дапускаюцца. Пачатак а 6 гад іне.

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ" — Савецкі фільм БЕЛЫ АРОЛ. Штодзённа 4 сэансы. Пачатак а 6 гадзіне. Каса адч. ад 4 гадз.

Дзіячы кіно-тэатр „ЮНЫ ПІНЭР" — Апошнія дні—2, 3 і 4 сакавіка Шакалы Равата у 9-ці частках. Пачатак сэансаў з 1 гадз. дня. Каса а 12 гадз. дня.

Даводзіцца да ведама студэнтаў „ВЗИНО" — ШТО — Беларускі філіял і кансультацыйнае бюро ПЕРАМЯСЬЦІЛІСЯ з памяшканьня НКФ БССР на Савецкую вуліцу, 59, другі паверх

Загадчык сэктара кадраў НКФ БССР СПАРЫХІН
Загадчык Беларускага філіала „ВЗИНО" ІВАШЧЭНКА

МЦРК — МЦРК

даводзіць да ведама і адначасова папярэджвае ўсіх грамадзян г. Менску, што ВЫДАЧА НОВЫХ НАБОРНЫХ КАРТАК будзе праводзіцца да 3 сакавіка 1931 г., пасьля чаго будзе спынена выдача новых картак. Грамадзяне, якія не атрымалі картак да гэтага часу, п'інны пасьпяшыць з атрыманьнем, бо інакш яны будуць пазбаўлены магчымасьці атрымаць паёк як за ЛЮТЫ, таксама і на далейшы час.

Праўленьне.

Галоўлітбел № 598.

ДЛЯ ЧАГО ПАТРЭБНА ШЧАЦІНА І КОНВОЛАС.

З шчаціны і конволасу робяцца на фабрыках тэхнічныя шчоткі, кісьці, валасяная тканіна, кручавы волас для прамысловасьці, будаўніцтва, суднабудаўніцтва і ваенных патрэб.

Робяцца таксама з шчаціны і конволасу шчоткі для чысткі коняй і скаціны, шавецкія, адзежныя, падлогавыя, для мыцьця бялізны, зубныя і іншыя шчоткі, якімі шырока абслугоўваюцца патрэбы працоўных мас.

Шчаціна і конволас апрацоўваецца на экспарт, які зьяўляецца ходкім і выгодным для нашай дзяржавы на ўсіх замежных рынках. На выручаныя грошы ад рэалізацыі шчаціны і конволасу набываюцца замежныя патрэбныя для сацыялістычнага будаўніцтва машыны, трактары і інш.

Кошт гадавой прадукцыі (тавары са шчаціны і конволасу) складае 9 мільёнаў рублёў у год, з якіх значную суму складае экспартная прадукцыя. Акрамя таго фабрыкі, якія апрацоўваюць шчаціну і конскі волас, даюць штогод сацыялістычнаму накапленьню да 1 мільёна рублёў прыбытку.

Шчаціна і конволас загатаўляюцца ўсімі раённымі і сельскімі загатоўчымі пунктамі, а таксама іх заборшчыкамі па наступнай цане:

1. Шчаціна хрыбтовая доўгая да 4¾ дзюймаў 10 руб. 50 к. кілёграм
„ „ кароткая да 4¾ „ 4 руб. 25 к. „
„ бакавая мяккая да 4¾ „ 4 руб. 20 к. „
„ „ „ ніжэй 4¾ „ 2 руб. 50 к. „
2. Конволас касіца—2 р. 40 к. кілёгр., абрубак—2 р. 70 кап. кілёгр. грыва—1 руб. 10 кап. кілёгр.
3. Кароўі хвасты—караўнак—95 кап. кілёграм.

Пры прыёмцы шчаціны і конволасу здатчык прэміюецца на 25 проц. таварамі і 75 проц. грашыма.

ЯК ЗДЫМАЦЬ ШЧАЦІНУ СА СЬВІНЫХ СКУР.

У тых выпадках, калі пры забоі сьвіні зьнімаецца скура, дык здымаць шчаціну трэба наступным чынам:

Скура прывешваецца да сьценкі з такім разьлікам, каб яна была нацягнута пасьля чаго такім-жа чынам, як і на сьвіні, кручком, зробленым з цьвіку, вышчыпваецца шчаціна ня ніжэй паўтара дзюйма. Шчаціна ніжэй гэтага здымаецца на гарбарнях тэхнічным спосабам. Колькі прадукцыя (тавар), якая робіцца з шчаціны і конволасу займае значнае месца ў нашай сацыялістычнай гаспадарцы, дык кожны здатчык (калгас, саўгас і інш.) павінен быць зацікаўлен у поўнай здымцы, зборцы і здачы шчаціны і конволасу.

БЕЛПУШЧАЦІНА.

Згодна пастановы міжведамственай нарады, Усім арганізацыям, якія карыстаюцца дзяржаўным транспартам, прапануецца ў пяцідзённы тэрмін прадставіць начальніку Менскай канторы Саюзтрансу ГАДАВЫЯ ПЛЯНЫ ПЕРАВОЗУ ГРУЗУ, ШТО МЯРКУЕЦЦА ДЛЯ АДПРАЎЛЕНЬНЯ НА СТАНЦЫЮ СА СТАНЦЫІ, А ТАКСАМА УСІХ УНУТРАНЫХ ПЕРАВОЗАК. Пляны павінны быць разьбіты па кварталах. Тыя арганізацыі, якія не прадставяць у тэрмін плянаў, лічыць будуць пазбаўлены магчымасьці карыстаньня дзяржаўным і каапэрац. транспартам.

Менская кантора Саюзтрансу.

Камісія ЦКК РСІ па чыстцы і праверцы БАН сазывае 3-га сакавіка ў памяшканьні Хэміка-Тэхналёгічнага Інстытуту (Земляробскі заў., стары будынак Пэдфаку)

СХОД СТУДЭНТАЎ

сумесна з рабочымі хэм. фарм. заводу, супрацоўнікамі хэм. лабораторыі НДІ, хэм. лабораторыі Інстытуту прамысловасьці, камітэту па хэмізацыі і супрацоўнікамі БАН.

АБВЕСТКА ДНЮ:

1) Даклад Інстытуту Хэміі.
2) „ брыгады аб дзейнасьці інстытуту і пасобных працаўнікоў.

КАМІСІЯ.

ПАПРАЎКА

У нумары 50 ад 1-га сакавіка нашае газэты памылкова надрукавана ў абвестцы „БЕЛСЕЛЬГАССНАБЖЭНЬНЯ" „кіраўнік Белсельгасснабжэньня—ТАДАЛІЛА, а трэба „кіраўнік Белсельснабжэньня—ТАЛАПІЛА".

Транспартны трэст Менгарсавету паведамляе дзяржустановы і членаў прафсаюзаў, што з 1 сакавіка г. г.

ТЭРМІН ЛЬГОТНЫХ АБАНЭМЭНТАЎ

для праезду на трамваі ўстанаўліваецца 2-месячны са дня куплі абанэмэнту

Праданыя трэстам абанэмэнты да 1 сакавіка сапраўдны да 30 красавіка

Ніякія прэтэнзіі ўставоў і асоб, не скарыстаўшых абанэмэнтаў на працягу 2-х месяцаў, у далейшым прымацца трэстам ня будуць і абанэмэнты лічацца АНУЛЯВАНЫМІ

Для выгоды пасажыраў з 1-га сакавіка ўстанаўляецца продаж абанэмэнтаў у трамваі па намінальным кошце пранзнога білету (абанэмэнт на 10 паездак коштам у адзін рубель).

ТРАНСПАРТТРЭСТ

ЗГУБЛЕНА даверанасьць на імя Дырэктара Беларускага Аддзяленьня Дзяржаўнага Усесаюзнага Аб'яднаньня Скуранай Прамысловасьці „Саюзскур" Цёмкіна, Алеся Міхасева, выдадзеная Праўленьнем „Саюзскур" 28 марта 1930 г. за № 132-03-437. Якую лічыць несапраўднай. Беларускае Аддзяленьне Саюзскур.

Праўленьне МЦРК даводзіць да ведама, што крама МЦРК № 89, Ленінская 3, з першага красавіка пераходзіць на самаабслугоўваньне. У ЗАЧЫНЕНЫ РАЗЬМЕРКАВАЦЬ прантавараў для студэнцтва гор. Менску. 4 сакавіка роўна а 8-й гадз. увечары ў памяшканьні мас. сэктару МЦРК (Савецкая, 43), 3 паверх, па-ой СКЛІКАЕЦЦА НАРАДА КАЛЯБОРО ўсіх навучальных устаноў па пытаньню СЫСТЭМЫ РАЗЬЙ РЫНАВАНЬНЯ тавараў і выбару крамай камісіі пры разьмеркавацелі вышэй паказанай крамы. Праўленьне МЦРК.

ЗГУБЛЕНЫ:

Накладная за № 432 на здачы бульбы і хлеба Антоненка П., выд. Астанковіцкім спаж. т-вам, квіт. 1396-п.

1. Партбілет за № 0802685 Букаўскага Я., выд. Аршанскім Акругкомам КП(б)Б, 2. Вучотна вайсковы білет № 3/3, выд. Аршанскім ваенкаматам, квіт. 1429-п.

Картка на каня пр-на с. Валоўскага Ф. С., квіт. 1397-п.

Вучотная конская кніжка за № 87 на імя Назарчук Р. К., квіт. 1398-п.

Каапэрацыйная кніжка за № 73 Аўрамава А., выд. Мазырскім ЦРК, кв. 1399-п.

Вайсковы білет, нарадж. 1909 г. на імя Назарчука А. Г., квіт 1400-п.

Каапэрацыйная кніжка за № 519 Бужана С. П., выд. Капаткевіцкім спаж. т-вам, кві